КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №24 (152)
◂ 3 ЛІПЕНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**ДЖОНАТАН МУР: "ПАВАЖАЙЦЕ МІНУЛАЕ, АЛЕ БУДУЙЦЕ БУДУЧЫНЮ!"** Стар. 6

**ХАНС-ГЕОРГ ВІК: НАВЕДАЮ ТОЛЬКІ ВОЛЬНУЮ БЕЛАРУСЬ**

Сваім меркаваннем наконт працэсаў трансфармацыі ў Беларусі падзяліўся былы кіраўнік місіі АБСЕ у Мінску Ханс-Георг Вік. Стар. 6

**МАЙКЛ ДЖЭКСАН — ЗДРАДНІК, ГЕНІЙ ЦІ ІСЛАМСКІ РАДЫКАЛ?**

Чорная Амерыка горача спрачаецца, якое месца заняў нябожчык Майкл Джэксан у яе гісторыі. Стар. 12

**ВЕРШНІКІ НА КОНЯХ. ПРАБЛЕМА ВЫБАРУ** Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Крыжыкі Монтэнегра**

**"Настраёвае чытво" з дарогі ад Марыі Мартысевіч**

▸ РАЗВАЖАННЕ

# БЕЛАРУСЬ, МІНСК, 3 ЛІПЕНЯ

*Аляксей Хадыка*

**З 1991 года Дзень Незалежнасці адзначаўся ў Беларусі 27 ліпеня, у дзень прыняцця Дэкларацыі аб суверэнітэце краіны. І ў гэтым была гістарычная логіка.**



Амаль праз два стагоддзі пасля расійскага імперскага, а затым савецкага панавання, Беларусь аднавіла паўнавартасную дзяржаўнасць, не насунутую знешнімі сіламі. Дзень жа 3 ліпеня быў прапанаваны як свята незалежнасці па выніках рэферэндуму 1996 года, што зламаў у нашай краіне сістэму падзелу ўлады. Масавая падтрымка пераносу свята на 3 ліпеня, за які па афіцыйных звестках выказаліся 88,18 працэнта выбарцаў, выглядае дзіўнавата. Так, дзень 3 ліпеня і ў савецкія часы адзначаўся, але без помпы, і як дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх войскаў. І не быў нават выхадным. Між тым, фактычнае выгнанне немцаў з Беларусі скончылася 27 ліпеня ў Беластоку і 28 ліпеня ў Брэсце.

Выдатны пісьменнік Валянцін Тарас, чые маладыя гады пачаліся ў партызанскім атрадзе, у інтэрв'ю Радыё "Свабода" ў 2003 годзе недарма зазначыў: "Перамога ў той вайне мела прынцыповае значэнне для будучыні нашай Бацькаўшчыны, хоць яна была здабыта пад чырвонымі сцягамі. Таму што ў гісторыі далёкі прыцэл. Калі б тады не ўдалося гэтага звера — германскі фашызм — знішчыць, дык я не ведаю, ці маглі б мы сёння жыць у нейкай Беларусі і марыць пра тую Беларусь, якую мы хочам, якой мы прагнем, за якую мы змагаемся".

Калі сёлета Беларусь святкуе 65-годдзе сваёй незалежнасці, паўстае пытанне: а якая ж была тая вайна, што пракацілася па Беларусі, — Вялікая Айчынная ці другая сусветная? Змаганне за незалежнасць ці чарговы страшны і трагічны раскол? І ў чым сутнасць незалежнасці? Для беларусаў вайна была, напэўна, другой сусветнай, бо пачалася 1 верасня 1939 года. Пачалася з нападу Германіі на Польшчу на яе далёкай заходняй мяжы. У польскай арміі служылі дзесяткі тысяч жыхароў Заходняй Беларусі, на той час грамадзян міжваеннай Польшчы. Вайна працягнулася 17 верасня паходам Чырвонай арміі на захад, ударам у спіну краіны, якая змагалася з фашыстамі. Высылкай тысяч і тысяч у Сібір і Казахстан, і часовым выратаваннем праз службу ў польскай Арміі Андэрса ў Палесціне і вайне на другім фронце ў Італіі са штурмам Монтэ-Касіна. А для тысяч — хуткім расстрэлам у Катыні.

Для акупаваных жыхароў Беларусі вайна зрабілася часам вусцішнага змагання за выжыванне. Перачакаць або паспрабаваць палегчыць свой лёс праз здраду і прыстасаванне. Да 50 тысяч асобаў пайшлі служыць у паліцэйскія фармаванні. І каля 15 тысяч адышлі разам з немцамі летам 1944 года. І здраднікі, і падманутыя. У партызанах — 60 тысяч у 1943 годзе і 375 тысяч у 1944-м — ратуюцца ад невыносных умоваў апошніх месяцаў вайны на зямлі Беларусі. Пры гэтым партызанка розная — і савецкая, і польская, і ўкраінская, і нацыянальная беларуская, і габрэйская. Змаганне за выжыванне, часам змаганне аднаго з адным.

1944 год прынёс вызваленне ад фашызму, але ці прынёс незалежнасць? Бо застаецца пытанне, чаму амаль 75 тысяч беларусаў не пажадалі вяртацца назад з лагераў у Германіі? Кіравала імі не толькі нячыстае сумленне, але і веданне таго, што нясе радзіме аднаўленне ў ёй савецкага парадку. Таму да шматмільённага ахвяр вайны, да "кожнага чацвёртага з беларусаў", дададзім жахлівы і чарговы грамадзянскі раскол.

Каб зразумець, чым была перамога над фашызмам на беларускай зямлі — вызваленнем ці здабыццём нацыянальнай свабоды, прыгадаем напісанае ў лютым 1990 года на заранку аднаўлення беларускай дзяржаўнасці эсэ-маніфест Уладзіміра Арлова "Незалежнасць — гэта". З кароткай фінальнай фармулёўкай: "Незалежнасць — гэта калі ад нараджэння да скону пачуваешся сваім чалавекам на сваёй зямлі". Яго варта перачытаць, каб зразумець, што і дагэтуль не ўсе натуральныя прыкметы незалежнасці зрабіліся ў Беларусі явай.

Так, мы не служым у войску за межамі сваёй зямлі за чужыя інтарэсы, мы нарэшце называем дзяцей беларускімі імёнамі (ці часта?), мы шануем памяць продкаў на Дзяды. Паступова, але няпроста аднаўляецца царква. Але спіс зусім не поўны. Бо "незалежнасць — гэта калі ты пойдзеш у школу, і цябе будуць вучыць на тваёй мове..." (беларускай, польскай, расійскай — для кожнага сваёй). І шмат што іншае. Ці перасталі піянерскія дружыны змагацца за чужыя імёны? Ці паважае свой народ — розны ў індывідуальных асобах і лёсах — яго ўлада? Ці дзеці ў школе нарэшце вывучаюць сваю гісторыю, а не варыянт яе бачання старэйшым братам? І ці беларусаў нарэшце не страшыць перспектыва жыць без гэтага старшага брата?

На знакамітым палатне Валянціна Волкава "Мінск. 3 ліпеня 1944 г." жыхары зруйнаванага нямецкімі і савецкімі бамбардзіроўкамі горада радасна вітаюць савецкія войскі. І радасць людзей, пэўна, сапраўдная: нарэшце скончылася вайна. А для мастака Валянціна Волкава, як і для многіх іншых мастакоў, якія засталіся ў акупацыі, — Ціхановіч, Даўгяла, Дучыц, Шыбнёў, і не толькі мастакоў — заканчвалася змушаная, дзеля выжывання, праца "пад немцамі" і пачыналася праца з новай уладай. Але разуменне трагедыі народа, які ў часы другой сусветнай вайны апынуўся паміж молатам і кавадлам, прыходзіць да яго нашчадкаў спакваля, і толькі ў апошні час. Той самы Валянцін Волкаў, даўно нябожчык, аўтар знакавай карціны пра 3 ліпеня, дачакаўся ўшанавання мемарыяльнай дошкай на доме, дзе жыў у Мінску. Як знак прымірэння. Пачуванне свайго чалавека на сваёй зямлі вяртаецца вельмі марудна. Да Незалежнасці нам яшчэ ісці. А пакуль павіншуем адзін аднаго са святам вызвалення Мінска!

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### МАГІЛЁЎ. БЮСТ У ПАДАРУНАК

Масква падаравала Магілёву бюст апошняга расійскага цара Мікалая ІІ. Каб пазбегнуць актаў вандалізму з-за неадназначных адносінаў да гэтай гістарычнай фігуры, яго размесцяць у абласным краязнаўчым музеі. З гэтай нагоды намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Фёдар Міхаенка адзначыў: “Мы ганарымся, што Мікалай ІІ жыў у нас, кіраваў. А зараз у абласным цэнтры з’явіўся турыстычны маршрут, прысвечаны знаходжанню цара ў нашым горадзе, таму бюст у Магілёве неабходны”.

Абласны цэнтр атрымаў ад Масквы таксама восем званоў для ўстаноўкі на гарадской ратушы.

### ПАСТАВЫ. ВЫШЫВАНКА ДА СВЯТА

Жыхарка вёскі Навасёлкі–1 Пастаўскага раёна, сябра Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, супрацоўніца пастаўскага Дома рамёстваў “Стары млын” Лілія Зарэцкая да 600-годдзя Паставаў, якое будзе ўрачыста святкавацца 3–5 ліпеня, вышыла палатно з гербамі гарадоў-пабрацімаў. У беларускага райцэнтра іх ажно 11 — расійскія Пушкіна і Курск, літоўскія Купішкіс, Шырвінтас, Рокішкіс і Швянчоніс, латвійскі Рэзекне, польскія Семятычэ і Вейхерава, італьянскі Сант-Арэстэ, эстонскі Йыхві. У цэнтры кампазіцыі — герб саміх Паставаў — на блакітным фоне рыбацкая сетка і тры рыбкі. Сімвалы вышытыя на саматканым кужалі, а назвы гарадоў падпісаны па-беларуску і ўпрыгожаны букетамі кветак. У дадатак на палатне размешчаны надпісы: “Гербы гарадоў-пабрацімаў нашых Паставаў”, “Сувязі, сяброўства, супрацоўніцтва, узаемадапамога, кантакты — назаўсёды”, “Квітнець гарадам навекі!”.

У калекцыі вышывальшчыцы ёсць і іншыя унікальныя працы. Гэта карта Пастаўскага раёна памерам 170х110 сантыметраў, на якой больш за 200 вёсак, рэкі, азёры, дарогі, лясы, цэрквы, касцёлы, аграэкатурыстычны комплекс “Салаўіны гай” і іншыя мясцовыя адметнасці. Кампазіцыя «Слова беларускае — вечнае», на якой знаходзяцца 34 назвы кніг вядомых літаратараў, і «Дрэва жыцця» — генеалагічнае дрэва ўласнага роду.

### МІКАЛАЕВА. ПАМЯЦЬ СУЧАСНІКАЎ

На працягу апошніх 10 год на ўзлесак ля вёскі Мікалаева прыходзяць пілігрымы, што ідуць з Віцебска ў Будслаў, каб ушанаваць памяць ахвяр “Смяротнага шляху” — вязняў з Беразвецкай турмы, якія былі тут расстраляныя 26 чэрвеня 1941 года. Паўвека толькі мясцовыя жыхары як маглі прыглядалі за месцам пахавання. Ксёндз Мечыслаў, які ўзначаліў мясцовы прыход, а таксама Фаіна Паўлаўна Бізунова і прыхаджане распачалі клопат аб увекавечванні памяці ахвяр, і з дапамогай польскага боку тут усталяваны помнік.

“Рух Салідарнасці Разам” (старшыня Вячаслаў Сіўчык) мае намер да 70-й гадавіны памяці ахвяр “Смяротнага шляху” сабраць як мага больш звестак пра гэту трагедыю, усталяваць абеліск, на якім было б хоць некалькі прозвішчаў бязвінна загінулых.

### АСТРАВЕЦ. КРУК АСУДЖАНЫ, АЛЕ НЕ ЗЛАМАНЫ

Суд Астравецкага раёна пакараў грамадскага актывіста Івана Крука, каардынатара стварэння грамадскага руху “Астравецкая атамная — гэта злачынства” на 700 тысяч рублёў за “распаўсюд друкаваных выданняў без выходных дадзеных”. Яшчэ ў красавіку Іван Крук перадаў суседу-пенсіянеру па аднаму паасобніку газеты “Новы час” і бюлетэняў “Глоток воздуха”, “Астравецкі веснік”, “Мирны атом”, “Вилейщина”, дзе абмяркоўваліся праблемы і наступствы пабудовы ў гэтым рэгіёне АЭС.

Пасля гэтага на кватэру пенсіянера завіталі міліцыянеры і канфіскавалі друкаваную прадукцыю. Міністэрства інфармацыі дало заключэнне, што канфіскаваная прадукцыя, акрамя газеты “Новы час”, выдадзена з парушэннем патрабаванняў аб выходных дадзеных. Пасля гэтага справа была перададзена ў суд.

Зараз праваабаронца рыхтуе пратэст у вышэйшыя судовыя органы.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

---

АДКРЫТЫ ЛІСТ

# ЖЫЦЦЁ АЎТУХОВІЧА ПАД ПАГРОЗАЙ

**Вядомы праваабаронца Алег Волчак, давераная асоба сям’і Аўтуховіча, і Аляксандр Камароўскі, старшыня арганізацыйнага камітэта па стварэнні рэспубліканскага грамадскага аб’яднання ветэранаў баявых дзеянняў “Абаронцы Айчыны”, 29 чэрвеня накіравалі генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь Рыгору Васілевічу адкрыты ліст.**



“Мікалай Аўтуховіч ужо 75 дзён галадае ў турме ў знак пратэсту супраць незаконнага ўтрымання пад вартай. Яго галадоўка ўжо перайшла тую рысу, за якой — прамая пагроза яго жыццю. Патрабаванні разабрацца ў сітуацыі з арыштаванымі прадпрымальнікамі з Ваўкавыска выказваюць як грамадзяне Беларусі, так і прадстаўнікі міжнародных арганізацый. Рэзалюцыя ПАСЕ ад 23 чэрвеня 2009 года таксама заклікае да незалежнага расследавання. Ваша маўчанне ў дадзенай сітуацыі выклікае здзіўленне”, — гаворыцца ў лісце.

Волчак і Камароўскі заўважаюць, што на ўсіх, хто праходзіць па справе, аказваецца моцны ціск, каб яны далі паказанні супраць М. Аўтуховіча, Ю. Лявонава і У. Асіпенкі.

У сувязі з тым, што жыццё Мікалая Аўтуховіча знаходзіцца пад пагрозай, аўтары ліста просяць генпракурора праверыць першасную інфармацыю, якая паўплывала на арышт, а таксама:

• змяніць меру стрымання на падпіску аб нявыяздзе, хатні арышт або іншую, не звязаную з утрыманнем пад вартай;

• звярнуць увагу на справу аб падпалах і гранатамёце і праверыць у цэлым законнасць утрымання пад вартай Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі;

• запрасіць міжнародных экспертаў, чыя незалежнасць не аспрэчвалася б бакамі, і такім чынам пацвердзіць або аспрэчыць наяўнасць у следства матываў для ўтрымання затрыманых пад вартай да суда.

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# КАЦОРА СПЫНІЎ ГАЛАДОЎКУ

**Лідэр гомельскіх апазіцыянераў Уладзімір Кацора, які быў арыштаваны судом за акцыю ў памяць зніклага 10 гадоў таму генерала Юрыя Захаранкі, спыніў сухую галадоўку, якая працягвалася шэсць дзён.**

Пра спыненне галадоўкі таксама заявілі старшыня гомельскай абласной арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі Васіль Палякоў і актывіст кааліцыі АДС Юрый Захаранка.

“Мы не можам рызыкаваць жыццём нашага лідэра, які на гэты момант знаходзіцца ў цяжкім стане, у яго рэзка пагоршылася здароўе”, — патлумачыў Палякоў.

Ён паведаміў, што 30 чэрвеня Кацора з сябрамі наведаў суд Цэнтральнага раёна, дзе яны даведаліся, што разгляд касацыйнай скаргі прызначаны на 22 ліпеня. “Гэта падкрэслівае, што ўлады не гатовы на супрацоўніцтва, ніякіх крокаў наперад мы не бачым. Замест таго, каб шукаць зніклага генерала Захаранку, праваахоўнікі пераследуюць людзей, якія нагадалі ім пра гэта. Працягваць галадоўку не мае сэнсу, таму што гэта нічога не мяняе, улады не зацікаўлены ў вырашэнні гэтых праблем”, — зазначыў Палякоў.

Цяпер вырашаецца пытанне пра тое, дзе Кацора будзе выходзіць з галадоўкі — у бальніцы ці дома. Таксама не вырашана пакуль, ці будуць працягваць галадоўку лідэр гомельскіх камуністаў (ПКБ) Уладзімір Сякерка і актывісты гэтай партыі Валерый Рыбчанка і Святлана Міхальчанка.

25 чэрвеня суддзя суда Цэнтральнага раёна Марына Дамненка пакарала ўдзельнікаў акцыі ў памяць генерала Юрыя Захаранкі штрафамі. Кацора быў арыштаваны на трое сутак. У зале пасяджэнняў палітык у знак пратэсту супраць рашэння суда аб’явіў сухую галадоўку. Пасля вызвалення з ІЧУ ён яе працягнуў. Галадоўку Кацора праводзіў у офісе арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі. 29 чэрвеня ў сувязі з пагаршэннем стану да яго



выклікалі “хуткую дапамогу”. Пасля агляду ўрач выклікаў нарад міліцыі для прымусовай шпіталізацыі. Міліцыянеры ўзялі заяву ад Кацоры пра адмаўленне ад шпіталізацыі.

У прыватным доме, дзе арандуе памяшканне офіс АГП, усе дні галадоўкі ішло супрацьстаянне апазіцыянераў і міліцыі. Супрацоўнікі міліцыі з 25 чэрвеня тройчы зрывалі расцяжкі “Галадоўка пратэсту”, а таксама некалькі разоў зафарбоўвалі разам з работнікамі камунальных службаў надпіс “Галадоўка”, якая з’яўлялася на варотах дома. Каля дома практычна пастаянна дзяжурыў нарад міліцыі.

**Алена Германовіч, БелаПАН**

---

КРЭДЫТ

# НОВЫ МІЛЬЯРД ДОЛАРАЎ

**Алена Запалянская**

**Міжнародны валютны фонд павялічыў памер крэдыту stand-by для Беларусі на 1 мільярд долараў, акрамя таго, у бліжэйшы час у краіну паступіць чарговы транш МВФ на 680 мільёнаў. Для гэтага афіцыйны Мінск быў вымушаны прайсці яшчэ крок да лібералізацыі эканомікі — пашырыць межы валютнага калідора для беларускага рубля.**

Беларускі бок разлічвае атрымаць новыя грошы ўжо ў першай палове ліпеня.

Праграма, якую ўзгаднілі з МВФ, прадугледжвае, што Беларусь захавае ў гэтым годзе збалансаваны бюджэт, будзе захоўваць адэкватна жорсткую грашова-крэдытную палітыку, забяспечыць большую гнуткасць абменнага курса ў калідоры +/- 10%, паглыбіць структурныя рэформы. Акрамя таго, запланавана сур’ёзная праграма па прыватызацыі. У МВФ спадзяюцца, што ў Беларусі будзе прыняты новы закон аб прыватызацыі і ўтворана прыватызацыйнае агенцтва.

Трэба адзначыць, што Беларусь ва ўмовах не атрыманага апошняга траншу крэдыту ад Расіі актыўна шукае грошы на Захадзе.

Пасля сустрэчы прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з амерыканскімі кангрэсменамі 30 чэрвеня, з’явілася магчымасць атрымання крэдытаў і з ЗША. Прынамсі, такія звесткі распаўсюдзілі па выніках сустрэчы з амерыканцамі прадстаўнікі апазіцыі.

У прыватнасці лідэр АГП Анатоль Лябедзька па выніках сустрэчы распавёў: “Яны ўсё ж пакуль не могуць і не хочуць верыць словам, а толькі справам. Таму яны дастаткова прыхільна паставіліся да формулы: крэдыты і інвестыцыі ў абмен на ўнутрыпалітычны дыялог і свабодныя выбары пры ўмове мараторыя на палітычныя рэпрэсіі і адсутнасці палітычных вязняў”.

Па меркаванню эканаміста Леаніда Злотнікава, практычна немагчыма разглядаць, які крэдыт лепей: расійскі ці МВФ. Крэдыт ад МВФ па стаўцы на 2% меней за расійскі, затое расійскі даецца пад умову 5 гадоў пралангацыі, калі выплачваюцца толькі працэнты, і грошы аддаваць трэба будзе толькі праз 15 гадоў невялікімі часткамі. А пазыка ад МВФ — на тры гады. “Праблема хутчэй палітыка-эканамічная, звязаная з адносінамі, у прыватнасці, Расіі і Беларусі. У Беларусі пры гэтым захоўваецца праблема дэфіцыту гандлёвага балансу, і ўжо трэба аддаваць запазычанасці, якія краіна зрабіла раней. Я калісьці падлічваў, што, каб захаваць узровень жыцця ў Беларусі, трэба знешніх “уліванняў” у эканоміку каля 1 мільярда долараў штомесячна. Ад МВФ засталося 1,7 мільярда плюс новы крэдыт у 1 мільярд — тры месяцы спакойнага жыцця. А потым будуць зноў праблемы”, — лічыць эканаміст.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПЕРАТРАХІВАЦЬ І ПЕРАТРАХІВАЦЬ!

Сяргей Салаўёў

**“Ператрахіваць”, здаецца, любімая справа прэзідэнта. Як і фраза пра тое, што “спрос будзет жэстачайшы”. Каго толькі прэзідэнт не “ператрахіваў” — і парламент, і КДБ, і Савет міністраў. Зараз чарга дайшла да Міністэрства ўнутраных спраў.**



Эмануіл Зельцэр

На нарадзе з аператыўна-начальніцкім складам органаў унутраных спраў 29 чэрвеня Аляксандр Лукашэнка заявіў, што лічыць неабходным рэфармаваць МУС.

“Наша міліцыя, шчыра кажучы, не горшая, чым у нашых суседзяў, — сказаў прэзідэнт. — І па эфектыўнасці, і гэтак далей. Не горшая. Але яна мае патрэбу ў пэўнай рэформе. Мы нарэшце павінны, узяўшыся за міліцыю, зрабіць яе кампактнай, стройнай. Калі трэба аддзяліць нешта ад міліцыі, давайце аддзяляць, трэба функцыямі нейкімі надзяляць міліцыю, давайце надзяляць, але якімі? Да першага студзеня гэты працэс павінен быць закончаны”.

Пры гэтым Лукашэнка спасылаўся на факты праверкі органаў МУС, якая была арганізавана па яго даручэнні Саветам бяспекі і Адміністрацыяй прэзідэнта. Толькі сёлета ў МУС было выяўлена 41 злачынства карупцыйнай скіраванасці. У іх учыненні браў удзел 31 супрацоўнік міліцыі. Шмат нараканняў выклікае раскрывальнасць злачынстваў і прафесіяналізм новых супрацоўнікаў.

Сапраўды, толькі за апошнія пяць месяцаў 2009 года злачынасць вырасла ў 28 раёнах краіны. Па-ранейшаму ёсць праблемы з якасцю следства і дазнання. У першым квартале з-за непаўнаты пракурорскіх праверак адменена больш за 3 тысячы рашэнняў аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы. Паводле слоў Лукашэнкі, асноўнай прычынай цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў застаецца п'янства. Удзельная вага злачынстваў у грамадскіх месцах сярод агульнай колькасці злачынстваў дасягнула 44%, колькасць асабліва цяжкіх павялічылася амаль на трэць, забойстваў з замахам на жыццё — на 50%. Прэзідэнт звярнуў увагу і на нізкую раскрывальнасць крадзяжоў: у асобных рэгіёнах краіны яна не перавышае 15%, а ў Мінску — 14%. Нізкай застаецца кампенсацыйнасць матэрыяльнага ўрону — толькі 17%, а па карупцыйных злачынствах — 28%.

Менавіта з-за гэтага трэба “ператрахнуць” МУС з пэўнай надзеяй на павышэнне яго эфектыўнасці. Але, як заўсёды, вінаватыя апынуліся “стрэлачнікі”. А былы міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў своечасова “саскочыў з тэмы”, і да яго прэтэнзіяў няма.

Нагадаем, што Навумаў сышоў у адстаўку толькі 6 красавіка гэтага года — фактычна, за тры месяцы да “разгромнай” нарады прэзідэнта. А да гэтага ён узначальваў МУС аж з 2000 года! Менавіта Навумаў за 9 год пабудаваў такую сістэму МУС, якой зараз так незадаволены прэзідэнт.

Выклікае пэўнае непаразуменне і яшчэ адзін факт: згодна ўказу прэзідэнта, Навумаў пайшоў у адстаўку “па стане здароўя”. “Па шэрагу прычын, адна з іх — жудасная стомленасць”, — казаў Лукашэнка. Але ж “жудасна стомлены” Навумаў дагэтуль працуе кіраўніком Федэрацыі хакея Рэспублікі Беларусь, і працуе настолькі добра, што наша краіна перамагла на выбарах краіны-арганізатара чэмпіянату свету 2014 года.

Узнікае нават падазрэнне: а не падказаў хтосьці Уладзіміру Навумаву своечасова сысці ў адстаўку непасрэдна перад “ператрахіваннем”?

З іншага боку падаецца, што “ператрахнулі” і самога Аляксандра Рыгоравіча. Варта было Лукашэнку сустрэцца з дэлегацыяй амерыканскіх сенатараў 30 чэрвеня, як у той жа дзень з беларускай “зоны” быў вызвалены амерыканскі грамадзянін Эмануіл Зельцэр. Гэтага дамагаліся шматлікія міжнародныя структуры, а таксама пасольства ЗША ў Беларусі амаль год. Дамагліся толькі сенатары.

У жніўні 2008 года юрыст Зельцэр быў прыгавораны Мінскім гарадскім судом да трох гадоў пазбаўлення волі за выкарыстанне заведама непраўдзівых дакументаў і замах на камерцыйны шпіянаж. 31 кастрычніка Вярхоўны суд пакінуў прысуд у сіле. Сваёй віны Зельцэр не прызнаў. З 8 па 25 чэрвеня Зельцэр праводзіў у калоніі галадоўку ў знак пратэсту супраць дзеянняў Мінскага гарсуда, які зацягваў падаванне ў калонію дакументаў, неабходных для яго амністыі. Лукашэнка падпісаў указ пра паміласаванне.

Канешне, мала спадзяванняў на тое, што мы даведаемся, пра што размаўлялі сенатары з Лукашэнкам, а таксама (гэта галоўнае) як яны гэта рабілі. Але ж ані Хаўер Салана, ані Беніта-Ферэра Вальднер гэтага не дамагліся. І, пэўна, Лукашэнку далі зразумець, што сюды прыехалі не “ваські”, не абазнаныя ў беларускіх пытаннях, а дасведчаныя і кампетэнтныя прадстаўнікі супердзяржавы. І Лукашэнка вымушаны быў саступіць.

Пытанне толькі ў тым, што паабяцалі кангрэсмены ў адказ на вызваленне Зельцэра. Можа, яго папросту “выкупілі”. Бо літаральна за дзень вызвалення Зельцэра савет дырэктараў Міжнароднага валютнага фонду завяршыў першы разгляд у межах дамоўленасці з уладамі Беларусі пра крэдыт стэндбай, зацвердзіўшы фактычнае выдзяленне крэдыту ў памеры 679,2 мільёна долараў і павялічыўшы аб'ём фінансавай падтрымкі да 3,52 мільярда. Першапачаткова ж аб'ём фінансавання праграмы эканамічных рэформ, разлічанай на 15 месяцаў, складаў прыблізна 2,51 мільярда долараў. Можа, Лукашэнку намякнулі, што без вызвалення Зельцэра дадатковая сума крэдыту будзе заблакаваная?

Але гэта — не больш чым здагадкі.

І яшчэ адна цікавая навіна. У Палацы прадстаўнікоў ствараецца рабочая група па распрацоўцы прапаноў па ўвядзенні мараторыя на смяротную кару. Пра гэта 29 чэрвеня на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміў старшыня парламенцкай камісіі па нацыянальнай бяспецы Віктар Гумінскі.

Нагадаем, што ўвядзенне мараторыя на смяротную кару — адна з патрабаванняў Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы для аднаўлення беларускаму парламенту статусу спецыяльнага запрашанага ў ПАСЕ. Такое рашэнне было прынятае 23 чэрвеня ў Страсбургу.

Цікава, навошта ў парламенце ствараць рабочую групу па мараторыю на смяротнае пакаранне? Мараторый — гэта ж не поўная адмена пакарання, а толькі прыпыненне яго ўжывання. Гэта не патрабуе ніякіх зменаў у законы Беларусі, чым займаецца парламент. Для ўвядзення мараторыя дастаткова ўказа прэзідэнта, ягонага дэкрэта ці чаго яшчэ, на чым ён можа паставіць свой аўтограф. Бачна, што пытанне смяротнага пакарання стане чарговым аргументам у гандлі — на гэты раз з Еўропай.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МІКАЛАЙ ПІНІГІН



www.kupala-theatre.by

Характар прынцыповага менеджэра праявіў новы мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Мікалай Пінігін. Пакуль толькі на словах. А час пакажа, наколькі яны будуць сугучныя са справамі. «Я ніколі не буду ставіць п'есу толькі таму, што гэта беларускі тэкст ці беларускі аўтар», — заявіў Пінігін журналістам, патлумачыўшы, што п'есы будуць найперш ацэньвацца з пункту мастацкай вартасці. Радыкальных пераменаў і звальненняў мастацкі кіраўнік не паабяцаў, хаця, паводле яго слоў, у Купалаўскім ёсць некаторыя праблемы сярод акцёраў сярэдняга ўзросту. У сувязі з унутранымі рэформамі бліжэйшым часам з рэпертуару тэатра знікнуць некалькі спектакляў, шэсць-сем — з вялікай сцэны, пяць — з малой. Малую сцэну Мікалай Пінігін хоча зрабіць эксперыментальнай пляцоўкай не толькі для маладых рэжысёраў і драматургаў, але і ў цэлым тым месцам, дзе «штосьці адбываецца як творчы працэс», перадае агенцтва БелаПАН. Бліжэйшым часам гледачы змогуць убачыць некалькі прэм'ер: п'есу Франсіса Вебера «Вячэра з прыдуркам», дзе Мікалай Пінігін выступае ў якасці рэжысёра-пастаноўшчыка, а таксама рэканструкцыю вечара ў Нясвіжскім палацы з выкарыстаннем элементаў балета і оперы. Другі спектакль будзе пастаўлены паводле сцэнару Уршулі Радзівіл, якая жыла ў XVIII стагоддзі і пісала п'есы для палацавага тэатра ў Нясвіжы. Яго прэм'ера прызначана на 2010 год.

### МІКАЛАЙ ЗАЙЧАНКА



Фота Юліі Дарашкевіч

Міністр эканомікі Беларусі Мікалай Зайчанка даволі арыгінальным спосабам рэалізуе праграму імпартазамяшчэння. “Я гэта не афішую, але я забараніў жонцы купляць імпартныя прадукты”, — расказаў міністр на брыфінгу ў Мінску, каментуючы асабісты ўнёсак кіраўніцтва Мінэканомікі ў абмежаванне спажывецкага імпарту.

Пры гэтым Зайчанка не лічыць, што ў перыяд крызісу трэба асабліва эканоміць. Паводле яго меркавання, для больш хуткага пераадолення крызісных з'яў неабходна больш купляць айчынных тавараў.

Акрамя ўласнага прыкладу, для стымулявання попыту на беларускія спажывецкія тавары ўрад падрыхтаваў праект адпаведнага дзяржаўнага рашэння: банкі будуць выдаваць спажывецкія крэдыты на набыццё беларускіх тавараў па палёгкавай стаўцы — 10 працэнтаў гадавых. Гэта пры тым, што апошнім часам банкі выдавалі спажывецкія крэдыты ў беларускіх рублях пад 22–23 працэнта гадавых.

### АЛЕГ КАЧАН



Фота "ПРЭСБОЛ"

Галоўны фатэль у Міністэрстве спорту і турызму на гэтым тыдні заняў Алег Качан.

Новапрызначанаму міністру 41 год. Нарадзіўся ён у мястэчку Чэрвень, а жыве ў Лагойску. У 1986 годзе скончыў Смілавіцкі саўгас-тэхнікум Дзяржаграпрама БССР, у 1992 годзе — Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна. Але не гэтым адметная фігура чыноўніка. У свой час Алег Качан стаў самым маладым загадчыкам аддзелам, потым намеснікам старшыні Лагойскага райвыканкама, затым начальнікам Мінскага абласнога ўпраўлення спорту. Алег Качан дагэтуль быў чалавекам непублічным і ў кулуарных інтрыгах асабліва не засвяціўся. Пасля заступлення на новую пасаду міністр даў інтэрв'ю спартыўнай газеце “Прэсбол”, якая была доўга ў “чорных спісах”, што ўжо з'яўляецца нечаканым, але абнадзейлівым ходам. Журналісты “Прэсбола” лічаць, што прызначэнне на пасаду міністра “маладога, падцягнутага, абаяльнага кіраўніка дорыць надзею на аб'ектыўныя, канструктыўныя перамены, якія вельмі патрэбныя сёння галіне”.

▸ **АД ПЕРШАЙ АСОБЫ**

# Джонатан МУР: “ПАВАЖАЙЦЕ МІНУЛАЕ, АЛЕ БУДУЙЦЕ БУДУЧЫНЮ!”

**7 ліпеня Часовы Паверраны ЗША ў Беларусі Джонатан Мур завяршае свае паўнамоцтвы. Напярэдадні яго ад’езду па новаму прызначэнню на дыпламатычную работу ў Боснію з ім сустрэўся шэф-рэдактар “Новага часу” Аляксей Кароль.**

***— Апошнім часам палітыка Еўрасаюза ў адносінах да Беларусі істотным чынам змянілася. Беларусь прынятая ў праграму “Усходняга партнёрства”. Нядаўна з афіцыйным візітам Мінск наведала еўракамісар Беніта Ферэра-Вальднер. Між тым, Злучаныя Штаты Амерыкі санкцыі не адмянілі. У кантэксце гэтых падзей, ці ёсць прынцыповыя адрозненні ў палітыцы ЗША і ЕС у адносінах да Беларусі?***

— І ў ЗША, і ў Еўрасаюзе, як гэта адзначала і Ферэра-Вальднер, ёсць вера ў вялікі патэнцыял, якім валодае Беларусь. І калі адбудуцца паляпшэнні, калі будуць праведзены дэмакратычныя рэформы па вызначаных накірунках, гэта дазволіць Злучаным Штатам паляпшаць адносіны з Беларуссю.

Думаю, што ёсць адрозненні на тэхнічным узроўні. Беларусь з’яўляецца суседам Еўрапейскага Саюза, але не з’яўляецца суседам Злучаных Штатаў. Мы — адна краіна, а не саюз 27 краінаў, і ў нас няма такой палітыкі ўсходняга партнёрства, як у Еўрасаюза. Але, дазвольце падкрэсліць, мы падтрымліваем праграму “Усходняга партнёрства”. Мы разглядаем яе як важны механізм паляпшэння сітуацыі ў розных сферах, у тым ліку і ў сферы правоў чалавека.

***— Вядома, што як у Беларусі, так і ў краінах ЕС існуюць адрозненні ў падыходах да рэалізацыі гэтай праграмы. Галоўным чынам па лініі “рэалпалітыка” ці каштоўнасці. Якім чынам гэта адбіваецца на пазіцыі ЗША? У чым ваш прыярытэт — каштоўнасці ці “рэалпалітыка”, прагматыка пэўных выгод?***

— Перавага, безумоўна, аддаецца каштоўнасцям. Гэта тыя самыя свабоды і каштоўнасці — агульныя і для Злучаных Штатаў, і для Еўрапейскага Саюза. І гэтыя каштоўнасці з’яўляюцца цэнтральнымі ў палітыцы ЗША, як у часы папярэдняй, так і пры цяперашняй адміністрацыі. Мы не любім санкцыі і хочам, каб іх не было. Але гэта сітуацыя можа змяніцца толькі ў выніку дыялога з Беларуссю.

***— Прайшло ўжо дастаткова часу, калі знешнепалітычны курс ЗША вызначае новая адміністрацыя прэзідэнта Барака Абамы. Што было ўзята ў спадчыну ад папярэдняй адміністрацыі і якія новыя нюансы можна акрэсліць у сучаснай палітыцы?***

— Дазвольце найперш адзначыць, што палітыка ў адносінах да Беларусі падзяляецца як дэмакратычнай, так і рэспубліканскай партыямі. У нас быў прэзідэнт-рэспубліканец, зараз — прэзідэнт-дэмакрат, але ў асноўным фундаментальная палітыка застаецца нязменнай. Як і палітыка кангрэса, якую падзяляюць абедзве партыі.

У гэтым кантэксце я вельмі рады, што 30 чэрвеня мы сустракалі тут, у Мінску, дэлегацыю кангрэса ЗША, якая прыбыла з візітам у Беларусь. У склад дэлегацыі ўваходзілі шэраг сенатараў і сябраў палаты прадстаўнікоў.

***— Мэтай візіту было папросту азнаямленне з сітуацыяй у Беларусі, ці існаваў разлік на магчымую карэкціроўку па яго выніках палітыкі ЗША?***

— Наколькі я памятаю, візіт падобнага ўзроўню адбыўся каля дзесяці гадоў таму. Зацікаўленасць у азнаямленні з сітуацыяй у Беларусі ўзрасла. І зразумела, гэты візіт даў магчымасць дэлегацыі скласці сваё меркаванне пра сітуацыю ў Беларусі. Яны прыязджалі сюды не як прадстаўнікі Барака Абамы, новай адміністрацыі. Яны прадстаўлялі саміх сябе. Нашаму кангрэсу належыць выключна ўплывовая роля ў фарміраванні палітыкі ў адносінах да Беларусі.

***— Геапалітычная вага Беларусі ў кантэксце знешняй палітыкі ЗША адносна невялікая ў параўнанні з краінамі Еўрасаюза. У такім выпадку, які практычны сэнс бачаць Злучаныя Штаты ў праводзенні актыўнай палітыкі ў адносінах да Беларусі? Ці не абумоўлена гэта расійскім фактарам?***

— Абмеркаванне адносін ЗША і Расіі знаходзіцца па-за межамі маёй прафесійнай адказнасці. Мы чакаем саміту з удзелам прэзідэнтаў Абамы і Мядзведзева ў сярэдзіне ліпеня. З улікам нядаўніх падзей адносіны паміж Беларуссю і Расіяй шырока абмяркоўваюцца. Магу вас запэўніць, што нашы адносіны з Беларуссю не залежаць ад адносін Беларусі з Расіяй. Беларусь — сусед і партнёр Расіі. Наш пункт погляду, наша занепакоенасць і нашы спадзяванні, якія мы звязваем з Беларуссю, не залежаць ад адносін Беларусі з Расіяй. Мы лічым, што наспелыя змены ў палітычнай сітуацыі, правядзенне рэформ мусяць адбывацца па ўнутраных рашэннях, прынятых у Беларусі, у незалежнасці ад Расіі.

***— Ці з’явіліся, на Ваш погляд, нейкія новыя падставы, каб бліжэйшым часам чакаць аднаўлення работы амерыканскай амбасады ў поўным складзе яе дыпламатычнага корпуса?***

— Мы заўсёды былі адкрытыя да вяртання беларускіх дыпламатаў, адкліканых з Вашынгтона. Мы неаднаразова ўздымалі пытанне пра адмену абмежавання колькасці амерыканскіх дыпламатаў у Беларусі. Але прагрэсу, на жаль, не наглядаем. Безумоўна, гэта было б пазітыўным крокам. Але гэта, магчыма, не ёсць нашым самым вялікім прыярытэтам. Хаця мы і працавалі ў складаных у бюракратычным сэнсе ўмовах, але самае галоўнае, што мы мелі магчымасць выконваць сваю работу. Мы знаходзімся тут, каб прадстаўляць інтарэсы Злучаных Штатаў. У мяне чацвёра цудоўных калег, і, думаю, мы працуем добра.

***— Трэба разумець, што хаця б намёку з беларускага боку пра вяртанне ранейшага статуса амерыканскай амбасадзе не было?***

— Я не атрымліваў такіх знакаў.

***— Ці адчуваеце Вы розніцу ў адносінах беларускага боку да Вас як прадстаўніка ЗША і да Вашых калег з амбасад еўрапейскіх краін з улікам прыняцця праграмы “Усходняга партнёрства”?***

— Шчыра кажучы, лічу, што на працягу года пасля таго, як была зменшана колькасць дыпламатаў, нашы адносіны з беларускімі ўладамі праходзілі на прафесійным узроўні. Прагучыць з ironіяй, але ў некаторых выпадках яны нават палепшыліся.

***— Вы прадоўжылі мараторый на частку санкцый. У якім выпадку санкцыі могуць быць пацверджаны, у якім канчаткова адменены?***

— Рашэнне па санкцыях будзе прымацца ў Вашынгтоне ў кастрычніку, або, магчыма, у лістападзе гэтага года. У нас няма спецыяльнага спісу, у якім канкрэтызавалася б, што павінна быць зроблена, што — не. Ёсць сігналы на тое, што беларускі бок мае намер зрабіць яшчэ некаторыя крокі. Мы павінны будзем даць ацэнку таму, што на гэтых напрамках адбылося ці не адбылося. Найперш з таго, пра што гаварыла Ферэра-Вальднер: свабода слова, свабода распаўсюджвання незалежных СМІ, зняцце перашкод па рэгістрацыі грамадскіх арганізацый і гэтак далей. Рэчы, якія для нас настолькі ж важныя, як і для ЕС. Дарэчы, Еўрапейскі Саюз будзе разглядаць пытанне пра санкцыі прыкладна ў той жа час, што і Вашынгтон. Мы вельмі шчыльна супрацоўнічаем з Еўрапейскім Саюзам. Я сустракаўся з дарадцамі Ферэры-Вальднер шмат разоў — у Брусэлі, Мінску, іншых месцах. Мае калегі таксама пастаянна кантактуюць з прадстаўнікамі ЕС на розных узроўнях. Перыяд кастрычнік-лістапад у аднолькавай ступені важны як для Злучаных Штатаў, так і для Еўрапейскага Саюза.

***— Прынцыповая аснова супрацоўніцтва, наколькі я разумею, — тыя самыя дванаццаць умоў ЕС для Беларусі, з якіх вылучаны ў якасці першасных пяць?***



— Мы не канкрэтызавалі нашы патрабаванні менавіта як дванаццаць ці пяць умоў, але мы іх таксама падзяляем.

***— Вызначэнне дыялога, на мой погляд, не зусім дакладнае. Хутчэй за ўсё, адбываецца працэс аднаўлення кантактаў паміж Захадам і Беларуссю, якія былі перарваныя ў выніку палітыкі самаізаляцыі кіраўніцтва Беларусі. І гэта, безумоўна, нармальны працэс, які натуральна прадугледжвае кантакты як з прадстаўнікамі ўлады, так і апазіцыі. Але наколькі, на Ваш погляд, з’яўляецца рэальнай перспектыва дэмакратычных рэформ у Беларусі?***

— Дыялог, які вядзе наша амбасада і які правяла дэлегацыя нашага кангрэса 30 чэрвеня, праходзіць менавіта ў такім фармаце: з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці, палітычных партый і прадстаўнікамі дзяржаўных структур. Што тычыцца перспектыў палітычных перамен, то, як і ў любой іншай краіне, у Беларусі такая магчымасць ёсць. Ёсць адпаведныя сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя фактары. Знешнія і ўнутраныя. Ніякая палітычная сітуацыя не можа заставацца нязменнай. У параўнанні з многімі еўрапейскімі краінамі, Злучаныя Штаты — усё яшчэ маладая краіна. Мы — сведкі многіх перамен у нашай краіне. У нас была грамадзянская вайна, было рабства, усяго менш за стагоддзе таму амерыканскія жанчыны атрымалі правы голасу. Толькі паўстагоддзя аддзяляе нас ад перыяду — дзякуй богу, непрацяглага — нагнятання страху ў грамадстве пад сцягам барацьбы з камунізмам, так званага “палявання на вядзьмарак”. І літаральна яшчэ некалькі гадоў таму ніхто б не даў станоўчага адказу на магчымасць абрання Барака Абамы прэзідэнтам ЗША. Але лозунгам яго кампаніі было: “Так, мы можам!”. У гэтым кантэксце непераадольнай логікі перамен мы можам з упэўненасцю сказаць, што ў Беларусі палітычным пераменам быць. Але калі — сказаць не магу.

***— У чым бачаць ЗША палітычную значнасць Беларусі ў еўрапейскім кантэксце?***

— Найперш Беларусь — гэта тая краіна, у якой у многіх амерыканцаў радавыя карані. Многія габрэйскія сем’і ў Злучаных Штатах могуць прасачыць сваю гісторыю з тых часоў, калі па беларускіх землях праходзіла рыса габрэйскай аселасці. Потым былі іншыя хвалі эміграцыі, у тым ліку апошняга двaццацігоддзя. Акрамя гэтага ёсць стратэгічны аспект. Беласусь — тая краіна, што мае агульную мяжу з краінамі NATO. Злучаныя Штаты падтрымлівалі імкненне цэнтральнаеўрапейскіх і балтыйскіх краін стаць сябрамі NATO. Падтрымлівалі з поўным разуменнем таго, што мы такім чынам набліжаем межы NATO да Беларусі. У спадзяванні, што гэта палепшыць і ўзмоцніць адносіны Беларусі з суседзямі.

Абсалютна відавочна, што амерыканскі бізнес зацікаўлены ў Беларусі. Гэта ключавая транзітная краіна на шляху да вялікіх рынкаў, расійскага, напрыклад. Якасць вытворчасці ў Беларусі ў некаторых сферах даволі высокая. І нягледзячы на складанасці, якія цяпер перажывае эканоміка, прадстаўнікі многіх сур’ёзных амерыканскіх бізнесаў прыязджалі ў Беларусь у пошуках сур’ёзных беларускіх партнёраў. І з палітычнага, і з эканамічнага пункту гледжан-

ня лёгка праглядаецца значны, пакуль што не выкарыстаны, патэнцыял.

Магчыма, з рэгіянальнага пункту погляду, маё меркаванне ў пэўнай ступені перадузятае. Мне давялося немалы час працаваць у Літве. Я прыехаў туды ў 1995 годзе і на ўласныя вочы бачыў, які маштабны рывок у сваім развіцці зрабіла краіна і як таму спрыялі інвестыцыі. І я ўпэўнены — і гэта пазіцыя ЗША, — што ў Беларусі патэнцыял не меншы, і яна заслугоўвае такога ж развіцця.

***— Ці можа эканамічная падтрымка Беларусі з Захаду кампенсаваць страту тых датацый, якія краіна мела ад Расіі на пастаўках нафты і газа на нізкіх цэнах?***

— Я не эканаміст, але ў мяне ёсць меркаванне на гэты конт. Магчымым сцэнарам можа быць паляпшэнне інвестыцыйнага клімату ў Беларусі. Апошнім часам шмат гаварылі пра малочную вайну паміж Расіяй і Беларуссю. Адна з галоўных праблем беларускай малочнай вытворчасці ў тым, што большасць з яе прадукцыі немагчыма экспартаваць на Захад, бо яна не адпавядае прынятым там стандартам. Новыя тэхналогіі, створаныя пры дапамозе заходніх інвестыцый пры ажыццяўленні прыватызацыі, такія магчымасці адкрываюць. Гэта толькі адзін з прыкладаў.

Калі ж весці размову пра пастаўкі энергіі, то многія краіны гэтага рэгіёну залежаць ад Расіі, але яны дастаткова моцныя, каб аплаціць іх па цэнах, вызначаных экспарцёрам. Што тычыцца Беларусі, то яна шмат год плаціла за энерганосьбіты па нізкіх цэнах. І гэта спарадзіла такія чаканні, якія не маглі быць падтрыманы ў кантэксце глабальнай эканомікі, глабальнага рынка. Выйсце бачыцца ў рэформах, якія могуць зрабіць краіну больш моцнай, з трывалай сучаснай эканомікай. У гэтым заключаецца і гарантыя незалежнасці, суверэнітэту Беларусі.

***— У свой час на прыкладзе Аляксандра Казуліна ЗША і Ваша амбасада прадэманстравалі прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей над усімі прагматычнымі разлікамі. Зараз у турме знаходзіцца Мікалай Аўтуховіч з калегамі. Якая пазіцыя на гэты конт ЗША і амбасады?***

— Мы назіраем за развіццём справы ў адносінах спадароў Аўтуховіча, Лявонава і Асіпенкі. Я асабіста размаўляў з кіраўніком офіса АБСЕ ў Мінску, амбасадарам Шмідтам пасля яго сустрэчы з Аўтуховічам. Мы, таксама як і члены сем'яў трох зняволеных, чакаем справядлівага суда, і як мага хутчэй. Мы вельмі занепакоеныя тым, што гэтая справа адцягваецца з лютага. І ўлады пра гэта ведаюць.

***— З улікам працы ў Літве, Вы ўжо больш дзесяці год знаходзіцеся ў нашым рэгіёне. Які вобраз Беларусі склаўся за гэты час у Вашым успрыняцці?***

— Краіны, якая, на мой погляд, мае вялікі патэнцыял. І ў гарадах, і ў вёсках я бачыў людзей таленавітых, з выбітнымі здольнасцямі. Я ўдзячны людзям за гасціннасць, за ветлівасць, з якой мяне сустракалі па ўсёй краіне. Хацеў бы, каб мага болей



Фота Юрыя Дзядзінкіна
Джонатан Мур, Аляксандр Казулін, Міхаіл Марыніч

амерыканцаў змаглі пазнаёміцца з вашай краінай. Многія амерыканцы, якія не часта, або і зусім ніколі не выязджалі з ЗША, мяркуюць, што Беларусь — гэта частка Расіі. Але гэта не частка Расіі, гэта — Беларусь. Брэст, Магілёў, Гомель, Полацк — гэта Беларусь. Гэта іншая краіна, і гэта краіна з еўрапейскай скіраванасцю. І калі тут у поўным аб'ёме ўсталююцца еўрапейскія каштоўнасці, то цалкам рэалізуецца і вялікі патэнцыял Беларусі.

***— Найбольш яркія Вашы ўражанні за гэтыя тры гады ў Беларусі? Моманты, сустрэчы, падзеі?***

— (Смяецца). Было шмат момантаў, каб падлічыць. Я яшчэ не зусім завяршыў сваю працу тут, магчыма, яшчэ рана для каментараў. Узгадаю адзін прыклад. 3 мая мінулага года я суправаджаў у паездцы да літоўскай мяжы сваіх калег, якіх абвясцілі персонамі non grata. Там было да 15 машын з маімі калегамі, членамі іх сем'яў, якія перасеклі мяжу. І толькі адна наша машына вярнулася назад. Бо трэба было працягваць працу. І вось усяго праз шэсць дзён, дзякуючы запрашэнню дуаена дыпламатычнага корпусу, я са сваімі калегамі-дыпламатамі ўдзельнічаў у цырымоніі ўскладання вянкоў на плошчы Перамогі. У суправаджэнні вайскоўцаў, дарэчы, памежнікаў. Мы прайшлі каля вечнага агню, міма афіцыйных асоб, уключна з вышэйшым кіраўніцтвам. Гэтыя дзве падзеі на працягу менш тыдня — адна з тых унікальных рэчаў, з якімі я сутыкаўся ў Беларусі.

***— У гады вайны нашы народы звязвалі цесныя саюзніцкія адносіны. Як бы Вы ацанілі гэты гістарычны кантэкст у праекцыі на магчымае аднаўленне цесных і сяброўскіх адносін паміж нашымі дзяржавамі і народамі?***

— Магчымасць заўсёды ёсць. Я не думаю, што для яднання народаў патрэбная вайна. Як сведчыць гісторыя, войны не надоўга забяспечваюць саюзніцкія адносіны. Але, сапраўды, мы тады разам набліжалі перамогу. І той савецкі лейтэнант, які паціскаў руку амерыканскаму лейтэнанту на Эльбе, дзякуй богу, да гэтага часу жыве ў Беларусі, у вёсцы Морыч. Я ездзіў да яго ў 2008 годзе. Для мяне быў вялікі гонар сустрэцца з ім. І было вельмі цікава слухаць яго расповед. Я вельмі рады, што ў мінскім Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ёсць экспанаты, прысвечаныя ролі Злучаных Штатаў. Акрамя таго, што мы змагаліся разам з агульным ворагам на франтах, мы аказвалі вялікую матэрыяльную падтрымку ў адпаведнасці з праграмай ленд-лізу. На гістарычным фоне больш выразна бачыцца сучасны патэнцыял нашых агульных інтарэсаў і развіцця нашых адносін.

І калі мы ўжо загаварылі пра гісторыю, дазвольце адзначыць яшчэ адзін момант. Многія кажуць пра амерыканцаў, што яны не памятаюць гісторыі і жывуць толькі сучаснасцю. Такое здараецца. Але ў сваёй большасці амерыканцы добра ведаюць і паважаюць уласную гісторыю. А тое, што мы глядзім у будучыню, — гэта ўласцівасць амерыканскага аптымізму. Мінулае нас не абмяжоўвае. Мінулае — гэта база, каб ісці далей.

***— Ваша пасланне жыхарам Беларусі перад ад'ездам?***

— У духу нашай размовы. Памятайце і паважайце мінулае, але будуйце будучыню! І вы знойдзеце ў Злучаных Штатах партнёра, які дапаможа дасягнуць поспеху.

ГЕАПАЛІТЫКА

# КАНГРЭСМЕНЫ НА ПРАСПЕКЦЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Аляксей Кароль

**Нават каб дэлегацыя амерыканскіх кангрэсменаў, што наведала Мінск 30 чэрвеня, усяго толькі спынілася тут для кароткага адпачынку па дарозе ў Вільнюс для ўдзелу ў сесіі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, гэты факт можна было б смела лічыць падзеяй у беларускім палітычным жыцці.**

Дэлегацый такога ўзроўню не было на Беларусі ўжо больш за 10 гадоў. За гэты час шмат хто з замежных палітыкаў атрымоўваў не запрашэнні, а адмовы ў візах і забароны на ўезд. Не далей як 3 мая мінулага года 11 амерыканскіх дыпламатаў былі высланы з Беларусі.

Аднак жа візіт — факт. Прычым афіцыйны. Прычым у межах паездкі ў краіны Балтыі і Балкан з дакладна вызначанай мэтай — умацаванне бяспекі і правоў чалавека. Тэма, якую афіцыйны Мінск упарта выносіў за рамкі любых перамоў. Пад тэму і адмысловы склад дэлегацыі, з якой 5 чалавек — чальцы Камісіі кангрэса ЗША па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (Хельсінская камісія), задачай якой якраз і з'яўляецца спрыяць дасягненню ўсеагульнай бяспекі праз выкананне правоў чалавека і дэмакратычных норм. Сярод іх сенатар Бенджамін Кардэн (дэмакрат, Мэрыленд), сустаршыня камісіі, кангрэсмены Элсі Гейстынгс (дэмакрат, Фларыда) і Крыстафер Сміт (рэспубліканец, Нью-Джэрсі), аўтар двух законаў, датычных Беларусі: "Акту аб дэмакратыі ў Беларусі 2004" і "Аднаўленага акту аб дэмакратыі ў Беларусі 2006". Законаў, якія ў беларускіх уладаў заўсёды выклікалі, мякка кажучы, адмоўную рэакцыю. У складзе дэлегацыі таксама — Дзік Дэрбін (дэмакрат, Ілінойс), памочнік лідэра большасці ў сенаце (другая па значнасці пасада ў амерыканскім сенаце).

Тым не менш, сустрэча кангрэсменаў з А. Лукашэнкам і, сіметрычна, — з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці, — таксама факт. Візіт уплывовых палітыкаў, меркаванне якіх наконт сітуацыі ў Беларусі пасля візіту ў нашу краіну можа мець сур'ёзныя наступствы для беларуска-амерыканскіх адносін.

Як падкрэсліў Бенджамін Кардэн у сваім выступе перад журналістамі на прэсавай канферэнцыі, якую правялі кангрэсмены ў амерыканскай амбасадзе тым жа днём, 30 чэрвеня: "Мы вернемся з гэтай інфармацыяй у Вашынгтон і будзем працаваць дзеля таго, каб у гэтай краіне адбыліся рэформы".

Матывацыя і мэты візіту ў Беларусь, чаканні і пажаданні, выказаныя чальцамі дэлегацыі падчас сустрэчы з А. Лукашэнкам, як можна меркаваць з іх выступаў і адказаў на пытанні журналістаў, уяўляюць сабой дастаткова прадуманую і стройную сістэму, якая зыходзіць з прыярытэту каштоўнасцей.

Прыехалі ў Беларусь, паколькі, на іх погляд, краіна не адпавядае патрабаванням Хельсінскай камісіі — на забеспячэнні правоў чалавека, рэлігійнай свабоды, правядзенні дэмакратычных і справядлівых выбараў, свабоды слова, свабоды дзейнасці для грамадскіх арганізацый, права апазіцыі супрацьпастаўляць сваё меркаванне меркаванням улады і не падвяргацца за гэта ціску і крымінальнаму пераследу.

Як адзначыў Крыстафер Сміт, гэта і ёсць дарожная карта, якую яны прапануюць А. Лукашэнку: "Мы падкрэслілі ў размове з прэзідэнтам, што словы — гэта добра, але справы — больш важна". І ў звязку з пытаннем пра санкцыі: "Прэзідэнт у размове з намі выказаў спадзяванне, што санкцыі будуць адменены. Наша дэлегацыя дала ясна зразумець, што ўсё залежыць ад яго. Мяч на яго баку поля".


Каля мікрафона — сенатар Бенджамін Кардэн

Кангрэсмены адзначылі некалькі, на іх погляд, канструктыўных момантаў. Сам факт, што беларускі ўрад аказаў падтрымку ў прыездзе дэлегацыі і ў арганізацыі сустрэч. Адкрытасць размовы з Лукашэнкам і магчымасць наўпрост давесці да яго бачанне сітуацыі ў Беларусі. Выказванне А. Лукашэнкі пра неабходнасць прыбраць усе бар'еры паміж нашымі краінамі з тым, аднак, мінусам, што ні адзін з гэтых бар'ераў не быў названы. "Такім чынам, — паводле высновы аднаго дэлегата, не пазбаўленай парадаксальнасці, — вельмі важна працягваць дыялог. Але перш, чым мы не ўбачым якія-небудзь дзеянні, я не бачу магчымасці весці гандаль, аказваць дапамогу або даваць крэдыты".

Неаднаразова быў адзначаны кангрэсменамі і адзіны пазітыўны вынік сустрэчы — вызваленне Эмануіла Зельцэра.

Найхутчэй, дыялог сапраўды будзе мець працяг. Ёсць спадзяванне, што ў тых умовах, у якія трапіла Беларусь, улады вымушаны будуць зрабіць і далейшыя крокі ў кірунку лібералізацыі.

МЕРКАВАННЕ

# Ханс-Георг ВІК: НАВЕДАЮ ТОЛЬКІ ВОЛЬНУЮ БЕЛАРУСЬ

**Беларусі не вярнулі статус адмыслова запрошанай у Парламенцкую Асамблею Савета Еўропы. Галоўнай і фактычна адзінай умовай для прадстаўлення чаканага статусу з'яўляецца ўвядзенне мараторыя на смяротнае пакаранне. Сваім меркаваннем наконт унутраных і знешніх працэсаў трансфармацыі ў Беларусі з карэспандэнтам "НЧ" Вольгай Хвоін падзяліўся былы кіраўнік місіі АБСЕ ў Мінску Ханс-Георг Вік. Цяпер дыпламат узначальвае ў Германіі арганізацыю «Правы чалавека ў Беларусі».**

Фота Наталлі Чухно



Амбасадар Ханс-Георг Вік

**— Як вы пракаментуеце тое, што Беларусь так і не атрымала статуса адмыслова запрошанага ў ПАСЕ, нягледзячы на папярэднія станоўчыя прагнозы?**

— У гэтых адносінах Беларусі яшчэ трэба многае зрабіць. Але цяпер на стале ў Савета Еўропы ляжыць рашэнне пра тое, каб зноў надаць Беларусі статус назіральніка, як гэты было ў 1990-я гады. Аднак для вяртання гэтага статуса ёсць умова: апазіцыя павінна ўдзельнічаць у пасяджэння Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы нароўні з афіцыйнай дэлегацыяй.

**— Прайшла інфармацыя, што Аляксандр Лукашэнка можа запрасіць ва ўрад прадстаўнікоў апазіцыі. Прынамсі, Аляксандру Мілінкевічу прарочылі месца віцэ-прэм'ера. Як вы ацэньваеце гэтыя магчымасці?**

— Я думаю, што гэта толькі спекуляцыя на ўрадлівай глебе, і распаўсюджваць іх нельга, бо рэальная сітуацыя выглядае інакш.

**— Еўропу абвінавачваюць у меркантыльнай пазіцыі да Беларусі. Вы згодныя з тым, што чыноўнікі ЕС кіруюцца хутчэй разлікам, чым каштоўнаснымі крытэрыямі?**

— Гэта няправільна. Канешне, вялікае значэнне маюць пытанні эканамічнага развіцця. Аднак апошні візіт камісара Еўрасаюза па знешніх сувязях і палітыцы добрасуседства Беніты Ферэра-Вальднер паказаў, што менавіта дэмакратычныя працэсы мусяць быць умоваю ўдзелу Беларусі ва "Усходнім партнёрстве". І апазіцыя, маладыя яе прадстаўнікі, грамадзянская супольнасць павінны быць пастаяннымі ўдзельнікамі перамоў, што тычыцца Савета Еўропы, АБСЕ, іншых структур.

**— Як вы ацэньваеце змены, што адбываюцца ў краіне? Ці маюць яны рэальны характар?**

— Я думаю, што гэта не толькі касметычныя мерапрыемствы. Гэта жаданне Мінска, кіраўніцтва краіны, атрымаць незалежнасць ад Масквы, атрымаць доступ да супрацоўніцтва з Заходняй Еўропай, скараціць аднабаковую залежнасць ад Масквы шляхам пашырэння заходніх опцый. Як далёка гэта пойдзе, мы паглядзім пазней. Але еўрапейская сістэма каштоўнасцяў з'яўляецца базай нашага існавання, яе нельга ігнараваць. Канешне, можна зрабіць нейкі крок, адсунуўшы ўбок каштоўнасці, аднак сістэма гэтых каштоўнасцяў ёсць асновай адносінаў. Еўропа сваім прыкладам паказвае і даказвае, што дэмакратыя і эканоміка мусяць ісці побач для кожнага асобнага чалавека і грамадства ў цэлым.

**— Ці можна казаць пра паляпшэнне адносін паміж Германіяй і Беларуссю?**

— Акурат у межах "Усходняга партнёрства" павінна быць больш сустрэчаў на афіцыйным узроўні. Аднак вельмі важна, каб у гэтым працэсе ўдзельнічала і грамадзянская супольнасць Беларусі. Праўда, гэтага, відаць, не будзе з той прычыны, што дэмакратычныя сілы не прадстаўленыя ў парламенце.

**— Ці маеце намер наведаць Беларусь бліжэйшым часам?**

— Мне адмовілі ў візе, таму я думаю, што наведаю толькі вольную Беларусь.

ЕЭС—БЕЛАРУСЬ

# "ПРАГМАТЫЧНА-ПРЫНЦЫПОВАЯ" ШВЕЦЫЯ

Вольга Хвоін

Падрыхтоўка рашэння пра адмену або працяг санкцый для Беларусі пачнецца ў кастрычніку, а само рашэнне, хутчэй за ўсё, будзе прынята ў лістападзе. Пра гэта паведаміў пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан на прэс-канферэнцыі, прысвечанай пачатку старшынства Швецыі ў Еўрасаюзе ў бліжэйшыя шэсць месяцаў.

"Мы спадзяемся, што беларускі бок зробіць належныя крокі, каб Еўрасаюз змог прыняць правільнае рашэнне", — зазначыў Стэфан Эрыксан. — Нармалізацыя стасункаў у інтарэсах як Еўрасаюза, так і Беларусі. Галоўнае — гэта дыялог і рух». Дыпламат адзначыў, што ЕС вітае перамены ў беларускім грамадстве. "Мы будзем надалей працаваць, каб працягваўся дыялог і кантакты. Важна весці дыялог адначасова з уладамі і грамадзянскай супольнасцю краіны, — падкрэсліў кіраўнік пасольства Швецыі. — Нас лічаць прагматычнай нацыяй, аднак у некаторых пытаннях мы займаем прынцыповую пазіцыю". Паводле слоў спадара пасла, падчас старшынства ў ЕС Швецыя будзе надаваць увагу аспектам абароны правоў чалавека і прававой дзяржавы.

Фота Юрыя Дзядзінкіна



Справа налева: амбасадар Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь Стэфан Эрыксан; часовы прадстаўнік іспанскага старшынства, якое пачнецца ў першай палове 2010 года, — амбасадар Вялікабрытаніі Найджэл Гулд-Дэвіс; часовы павераны ў справах Еўрапейскага Саюза ў Беларусі, амбасадар Жан-Эрык Хольцапфель

"Еўрапейскі Саюз стаіць на парозе вырашальнага часу. Разам мы павінны справіцца з эканамічным крызісам і беспрацоўем, а таксама аб'яднаць свет для барацьбы са змяненнямі клімату. Шведскае старшынства прымае гэтыя выклікі", — такімі словамі акрэсліў мэту старшынства прэм'ер-міністр Швецыі Фрэдрык Райнфельд.

Сярод прыярытэтаў ЕС пад старшынствам Швецыі — развіццё стасункаў з краінамі Балтыйскага рэгіёну, Еўрапейскай палітыкі добрасуседства, і ў прыватнасці праграмы "Усходняе партнёрства". У межах апошняй на 27 ліпеня запланаваная сустрэча «тройкі» Еўрасаюза (у якую цяпер уваходзяць генеральны сакратар Рады ЕС Хаўер Салана, еўракамісар па знешніх сувязях Беніта Ферэра-Вальднер і кіраўнік МЗС Швецыі Карл Більт) з кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Беларусі Сяргеем Мартынавым. 7 снежня мусіць адбыцца сустрэча кіраўнікоў МЗС у рамках праграмы «Усходняга партнёрства».

Двухбаковых сустрэч паміж кіраўніцтвам Беларусі і Швецыі пакуль не плануецца. Што тычыцца вырашэння для беларусаў візавага пытання, то спадар Эрыксан зазначыў, што "спадзяванні мусяць быць, і яны ёсць". Аднак, хутчэй за ўсё, гэтая праблема за час старшынства Швецыі вырашаная не будзе. "У Бруселі ўжо прынятае новае заканадаўства адносна візаў, якое ўступіць у дзеянне праз шэсць месяцаў. Яно прадугледжвае зніжэнне коштаў на візы для дзяцей да 12-ці гадоў", — паведаміў дыпламат.

Што тычыцца эканамічнай падтрымкі Беларусі, то, як паведаміў кіраўнік прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі Жан-Эрык Хольцапфель, рашэння наконт вылучэння Еўрасаюзам крэдыту Беларусі пакуль няма. «Беларусь зрабіла гэты запыт зусім нядаўна, і дакладна сказаць, калі будзе вынесенае рашэнне, пакуль немагчыма. Трэба чакаць», — зазначыў дыпламат.

ПАЛАТА

# ХУТКА І КАНСТРУКТЫЎНА

Вольга Хвоін

**Завяршыла сваю працу другая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.**

Апошняе пасяджэнне парламенту пачалося са спазненнем на паўтары гадзіны. Прычынай затрымкі сталі сустрэчы спікера Уладзіміра Андрэйчанкі з дэлегацыяй Вярхоўнай Рады Украіны і кангрэсменамі ЗША. Дэпутаты хуценька без доўгіх абмеркаванняў прынялі ў першым чытанні шэраг змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законапраекты.

Найбольш цікавым ёсць унясенне нормы ў праект Закона "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дэклараванння фізічнымі асобамі прыбыткаў, маёмасці і крыніцаў грашовых сродкаў", якая прадугледжвае абмежаванне пераліку, за які падатковыя органы маюць права патрабаваць дэкларавання прыбыткаў — не больш дзесяці поўных каляндарных гадоў, што папярэднічаюць году, у якім быў накіраваны пісьмовы запыт аб прадстаўленні дэкларацыі аб прыбытках і маёмасці. Акрамя таго, унесеныя ўдакладненні ў тэрміналогію закона, уключаны пералік прыбыткаў, якія не падпадаюць пад дэкляраванне.

Спікер Уладзімір Андрэйчанка заявіў, што праца сесіі прайшла "канструктыўна і па-дзелавому". За гэты час было разгледжана 95 пытанняў, прынята 35 законапраектаў у першым чытанні, 27 — у другім, 13 праектаў законаў аб ратыфікацыі міжнародных дамоў, разгледжана дзевяць дэкрэтаў кіраўніка дзяржавы. Сярод законапраектаў найбольшы рэзананс мелі праект Закона "Аб амністыі ў сувязі з 65-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў", а таксама ўнясенне паправак у крымінальны і адміністрацыйны кодэксы, якія забараняюць піццё піва і іншых слабаалкагольных напояў у грамадскіх месцах.

Законапраект прадугледжвае прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці парушальнікаў новых нормаў — ужыванне алкаголю на вуліцы абыдзецца ў восем базавых велічынь. Калі на працягу года пасля накладання спагнання парушальніка зноў злавіць за распіваннем спіртнога ў грамадскім месцы, яму будзе пагражаць штраф у памеры ад 2 да 15 базавых велічынь або адміністрацыйны арышт. Паленне ў грамадскім месцы будзе карацца штрафам да 4 базавых велічынь. Гэтыя нормы будуць дзейнічаць на практыцы, калі законапраект прыме Савет міністраў, а таксама падпіша кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў старшыні парламента Уладзіміра Андрэйчанкі, асаблівасцю гэтай сесіі стала "актывізацыя дыялога з еўрапейскімі парламенцкімі структурамі, у першую чаргу з Парламенцкай Асамблеяй Савета Еўропы". "Зробленая вялікая праца ў накірунку аднаўлення для Нацыянальнага сходу Беларусі статуса адмыслова запрошанага ў ПАСЕ", — падкрэсліў спікер.

Нагадаю, што напрыканцы чэрвеня ў "палатцы" была створаная працоўная група па распрацоўцы прапановаў па ўвядзенні мараторыя на смяротнае пакаранне. Увядзенне мараторыя на смяротную кару — адно з патрабаванняў Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы для аднаўлення Беларусі статусу адмыслова запрошанага ў ПАСЕ. Старшыня Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь Валерый Сукала 25 чэрвеня заявіў, што судовая сістэма Беларусі гатовая да таго, каб у краіне адмянілі смяротную кару.

"Калі ў Канстытуцыі Беларусі смяротная кара пазначаная як часовая, то гэтая норма непазбежна пацягне за сабою яе адмену. Мараторый на ўжыванне смяротнай кары — гэта мера прамежкавая", — адзначыў старшыня Вярхоўнага суда. Пажыццёвае зняволенне ў беларускім заканадаўстве было замацавана ў 1999 годзе. За гэты час да пажыццёвага пазбаўлення волі былі асуджаныя 130 чалавек. Летась да пажыццёвага зняволення ў Беларусі было асуджана 7 чалавек, а да смяротнай кары — 2 чалавека.

Разам з тым па выніках сесіі засталася нявырашанай палітычная інтрыга пра прызнанне незалежнасці Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Калі не будзе склікана пазачарговае пасяджэнне, то пытанне можа быць унесенае на разгляд восенню.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 6 ЛІПЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**05.35** Серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.10, 15.25** "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
**09.15** Nota Bene.
**09.40** "Здароўе".
**10.10** Жаночае ток-шоу "Жыццё як жыццё". "Я супраць сэксу да шлюбу".
**11.05** Серыял «Два бакі адной Ганны».
**12.10** Серыял "Эўрыка" (ЗША). 1-я серыя.
**13.35** Камедыйны серыял "Клініка" (ЗША).
**14.05** "Будні чэмпіёнаў". Андрэй Крайноў.
**14.30** Відэафільм АТН "Зброя Перамогі. Брэсчына".
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Вострасюжэтны серыял "Двое з куфара".
**16.50** Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
**17.50** Серыял «Два бакі адной Ганны».
**18.50, 00.00** "Зона Х". Крымінальная хроніка.
**19.30** "На грані "Дыямента". Відэафільм АТН.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** Відэафільм АТН "Прабач мяне".
**22.15** Серыял "Доктар Хаўс" (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Камедыйны серыял "Офіс" (ЗША).

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
**09.05** Контуры.
**10.10** Тэорыя неверагоднасці. "Жыццё пасля жыцця".
**10.40** Мультфільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** "Кантрольны закуп".
**11.40** "Ералаш".
**12.00** "Малахаў+".
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** "Зразумець. Прабачыць".
**13.45** "Яны ваявалі за Радзіму. Васіль Корж".
**14.45** "Жадаю ведаць" з Міхаілам Шырвіндтам.
**15.10** АНТ прадстаўляе: "Рэкламная паўза".
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** "Прынцэса цырка". Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял "Мая выдатная няня".
**19.05** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў "Выбар".
**22.05** "Цень самурая". Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** "Мотафрыстайл. Сусветная серыя".
**00.30** "Зваротны адлік". "Горад, паўсталы з попелу".
**01.00** Нашы навіны
**01.15-01.25** Навіны спорту.

**06.00** "24 гадзіны".
**06.10** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**07.30** "24 гадзіны".
**07.40** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**08.30** "Тыдзень".
**09.30** "Вялікі сняданак".
**10.00** "Пяць гісторый".
**10.30** "24 гадзіны".
**10.40** "Танга ўтрох". Тэленавела.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** "Сіла прыцягнення". Серыял.
**13.30** "24 гадзіны".
**13.50** Фільм "На спіне у чорнага ката".
**15.35** "Я - вандроўца".
**16.00** "Культурнае жыццё" з А.Ефрэмавым.
**16.30** "24 гадзіны".
**16.50** "Спартовы тыдзень".
**17.10** "Наша справа".
**17.20** "Міншчына".
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** "Сіла прыцягнення". Серыял.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** "Сталічныя падрабязнасці".
**20.10** "СТБ-спорт".
**20.15** "Добры вечар, маляня".
**20.30** Фільм "Сёмы пялёстак". Расія, 2006 г.
**22.30** "24 гадзіны".
**22.55** "СТБ-спорт".
**23.00** "Сталічны футбол".
**23.30** "Гучная справа".
**00.25** "Людзі Шпака". Серыял.

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Тэлебарометр.
**08.45** Гаспадар.
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
**11.05** Меладрама "Айчым" (Украіна).
**12.50** Мультсерыял "Джордж з джунгляў".
**13.35** Гіпноз.
**14.25** Пазакласная гадзіна.
**14.35** Таемны густ.
**15.05** Экспедыцыя.
**15.35** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**17.35** Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял "Вяртанне Турэцкага".
**19.45** Беларуская часіна.
**20.35** Калыханка.
**20.55** Экспедыцыя.
**21.00** Камедыя "Забойны футбол".
**22.35** "Іншыя". Псіхалогія крыміналу.
**23.05** Серыял "Сям'я Манн - стогадовы раман".

**РОССИЯ**

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** "Ранішняя пошта".
**09.50** Фільм "Камедыя памылак". 1-я серыя.
**11.00** Весткі.
**11.30** "Камедыя памылак". 2-я серыя.
**12.35** Т/ф "ТАСС упаўнаважаны заявіць..."
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** "Пакой смеху".
**16.00** "Пётр Алейнікаў. Няправільны герой". Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** "Кулагін і партнёры".
**17.55** "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял "Кармеліта".
**21.20** Руская серыя. Прэм'ера. "1941". Расія.
**22.20** Тэлесерыял "Трое супраць усіх-2".
**23.20** "Нічога асабістага". Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** "Весткі+".
**00.05** "Падрадкоўнік". Фільм 1-ы "Мір".
**01.50** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
**08.05** Серыял "Лебядзіны рай".
**09.00** Сёння. Выніковая праграма.
**10.00** Сёння.
**10.20** "Кулінарны паядынак".
**11.10** "Кватэрнае пытанне".
**12.10** Прэм'ера. "Сярэдні клас".
**13.00** Сёння.
**13.35** Серыял "Вяртанне Мухтара-2".
**15.05** Серыял "Аэрапорт".
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял "Вуліцы разбітых ліхтароў".
**18.15** "Выратавальнікі".
**18.35** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял "Правіла лабірынта".
**21.35** "Вочная стаўка".
**22.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**23.00** Сёння.
**23.20** Серыял "Псеўданім "Албанец-2".
**00.15** Дэтэктыўны серыял "Эксперты".
**01.00** "Школа зласлоўя". Хведар Бандарчук.

**EUROSPORT**

**09.30** Матаспартовы часопіс.
**09.45** Веласпорт. Тур дэ Франс. Навіны.
**10.00** Веласпорт. Тур дэ Франс. Манака - Брыньоль. Францыя. Этап 2. Агляд.
**11.00** Футбол. Таварыскі матч.
**12.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Порта (Партугалія). Гонка 2. Агляд.
**13.30** Веласпорт. Тур дэ Франс. Манака - Брыньоль. Францыя. Этап 2.
**15.15** Веласпорт. Тур дэ Франс. Марсэль - Ля Гранда Мот. Францыя. Этап 3.
**18.30** Футбол. Таварыскі матч.
**20.00** Найдужыя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў.
**21.00** Веласпорт. Тур дэ Франс. Навіны.
**21.20** Вось дык так!!!
**21.30** Армрэстлінг. PAL/NAL.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Веласпорт. Тур дэ Франс. Марсэль - Ля Гранда Мот. Францыя. Этап 3. Агляд.
**00.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**01.30** Веласпорт. Тур дэ Франс. Марсэль - Ля Гранда Мот. Францыя. Этап 3.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** "Элі Макбіл", тэлесерыял: V сезон.
**19.50** На кола (аўтамабільны тэлечасопіс каналу "Нямецкая хваля")
**20.15** МакраФон: "Minsk-Mixt-2008", ч. 5: канцэрт гурта "Ветах"
**20.30** Госць "Белсату": Гары Паганяйла
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: "Рагвалод і Рагнеда".
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне)
**21.20** "Увага, дзверы зачыняюцца", маст. фільм, рэж. Пітэр Гоўіт, 1998 г., Вялікая Брытанія - ЗША.
**22.50** Аб'ектыў
**23.20** «Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў», 1 серыя: «Валютная палітыка».
**23.40** Аб'ектыў.

## 7 ЛІПЕНЯ, АЎТОРАК

**05.35** Серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** Відэафільм АТН "Зямля беларуская. Вытокі".
**09.05** Слова Мітрапаліта на Каляды Іаана Прадцечы.
**09.15, 13.55** "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
**09.20** Дэтэктыўны серыял "Карамболь" (Расія).
**10.10** Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
**10.55** Серыял «Два бакі адной Ганны».
**11.40** Відэафільм АТН "Навагрудак: ля вытокаў дзяржаўнасці" цыкла "Зямля беларуская".
**12.10** Серыял "Эўрыка" (ЗША). 2-я серыя.
**13.05** Фантастычны серыял "Героі" (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Д/ц "Нябачны фронт".
**16.05** Вострасюжэтны серыял "Двое з куфара".
**16.55** Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
**17.50** Серыял «Два бакі адной Ганны».
**18.50, 00.00** "Зона Х". Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял "Карамболь" (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Серыял "Доктар Хаўс" (ЗША).
**23.30, 00.20** Камедыйны серыял "Офіс" (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** "На ўсё дзеля каханні".
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** "Кантрольны закуп".
**11.40** "Ералаш".
**12.00** "Малахаў+".
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** "Зразумець. Прабачыць".
**13.45** "Яны ваявалі за Радзіму. Кірыл Арлоўскі".
**14.45** "Жадаю ведаць" з Міхаілам Шырвіндтам.
**15.10** "Гарачы лёд". Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** "Прынцэса цырка". Шматсерыйны фільм.
**17.10** "Хай кажуць" з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** "Мая выдатная няня".
**18.55** "Рудая". Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** "Бурштынавы барон". Шматсерыйны фільм.
**22.10** "Цень самурая". Шматсерыйны фільм.
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** "Разам назаўжды".
**00.35** "Шпіталь каралеўства". Серыял.
**01.20** Нашы навіны.
**01.35-01.45** Навіны спорту.

**06.00** "24 гадзіны".
**06.10** "Міншчына".
**06.20** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**07.30** "24 гадзіны".
**07.40** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**08.30** Фільм "Сёмы пялёстак". Расія, 2006 г.
**10.05** "Пяць гісторый".
**10.30** "24 гадзіны".
**10.40** "Танга ўтрох". Тэленавела.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** "Сіла прыцягнення". Серыял.
**13.30** "24 гадзіны".
**13.50** "Крокі да поспеху" з Алінай Кабаевай.
**14.40** "Гадкае качаня". Моладзевы серыял.
**15.30** "Рэтраманія".
**16.30** "24 гадзіны".
**16.50** "Сталічны футбол".
**17.20** "Міншчына".
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** "Сіла прыцягнення". Серыял.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** "Сталічныя падрабязнасці".
**20.10** "СТБ-спорт".
**20.15** "Добры вечар, маляня".
**20.30** "Цень Самурая". Серыял.
**21.30** "Крот". Серыял.
**22.30** "24 гадзіны".
**22.55** "СТБ-спорт".
**23.00** "Аўтапанарама".
**23.20** "Надзвычайныя гісторыі".
**00.15** "Людзі Шпака". Серыял.

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Серыял "Вяртанне Турэцкага" (Расія).
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
**11.00** Дэтэктыўны серыял "Двайняты" (Расія).
**11.50** Серыял "Вераніка Марс" (ЗША).
**13.20** Гіпноз.
**14.10** Мультсерыял "Джордж з джунгляў".
**14.35** Пазакласная гадзіна.
**14.45** Бітва экстрасэнсаў.
**15.40** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**17.35** Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял "Вяртанне Турэцкага" (Расія).
**19.45** Беларуская часіна.
**20.35** Калыханка.
**20.55** Экспедыцыя.
**21.00** Спорт-кадр.
**21.30** Моладзевы трылер "Бі-Манкі".
**23.05** "Іншыя". Псіхалогія крыміналу.
**23.35** Серыял "Сям'я Манн - стогадовы раман".

**РОССИЯ**

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.25** Тэлесерыял "Кармеліта".
**11.00** Весткі.
**11.20** "Нічога асабістага". Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.35** Тэлесерыял "1941". Расія, 2009 г.
**12.25** Тэлефільм "ТАСС упаўнаважаны заявіць".
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял "Трое супраць усіх-2".
**15.15** "Гарадок". Дайджэст.
**15.50** "Смерці няма. Таямніца акадэміка Бехцерава". Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** "Кулагін і партнёры".
**17.55** "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**21.20** Тэлесерыял «1941». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** "Весткі+".
**23.50** Прэм'ера. "Падрадкоўнік". Фільм 2-ы "Іншаземка".
**00.35** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
**08.05** Серыял "Лебядзіны рай".
**09.00** "Праграма Максімум. Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні".
**10.00** Сёння.
**10.20** "Агляд".
**10.50** "Жаночы погляд" Аксаны Пушкінай.
**11.20** Вострасюжэтны серыял "Псеўданім "Албанец-2".
**12.05** Прэм'ера. "Сярэдні клас".
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Мухтара-2".
**15.10** Серыял "Аэрапорт".
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял "Вуліцы разбітых ліхтароў".
**18.10** "Чыстасардэчнае прызнанне".
**18.35** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял "Правіла лабірынта".
**21.35** "Вочная стаўка".
**22.35** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**23.00** Сёння.
**23.20** Вострасюжэтны серыял "Псеўданім "Албанец-2".
**00.15** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Эксперты".

**EUROSPORT**

**09.30** "Алімпійскія гульні". Алімпійскі часопіс.
**10.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Марсэль - Ля Гранда Мот. Францыя. Этап 3.
**11.45** Паралімпійскія віды спорту. Кубак свету. Манчэстэр (Вялікабрытанія).
**12.45** Футбол. Таварыскі матч.
**14.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Марсэль - Ля Гранда Мот. Францыя. Этап 3. Агляд.
**15.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Манпелье. Францыя. Этап 4.
**18.45** Футбол. Таварыскі матч.
**20.45** Вось дык так!!!
**21.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Навіны.
**21.15** Бокс. Міжнародны паядынак. Сярэдняя вагавая катэгорыя. Джон Дадзі (Вялікабрытанія) - Б.Лайел (ЗША). ЗША.
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Манпелье. Францыя. Этап 4. Агляд.
**00.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**00.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Вялікабрытанія. Агляд.
**01.00** Матаспартовы часопіс.
**01.15** Вось дык так!!!
**01.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Манпелье. Францыя. Этап 4.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

19:00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
19:05 "Ранча", серыял: 41 серыя
20:00 Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
20:30 Побач з намі (найлепшыя сюжэты праграмы "Рэпарцёр")
20:50 Гісторыя пад знакам Пагоні: "Дзяржавы" (пазнавальная праграма)
21:00 Аб'ектыў (галоўнае выданне)
21:20 "Кансультацыя ў ружовым садзе", серыял: 14 серыя
22:10 Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу "Нямецкая хваля")
22:40 Аб'ектыў

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 12 ЛІПЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**06.50** Серыял "Мая мама - ветэрынар". Закл. серыі.
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 14.20** Навіны.
**09.05** Слова Мітрапаліта Філарэта ў Дзень Святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла.
**09.20** "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
**09.25** Арсенал.
**09.50** Серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
**10.50** Культурныя людзі.
**11.25** У свеце матораў.
**12.10** "Славянскі базар у Віцебску-2009". Дзённік.
**12.15** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Лірычная камедыя "Паласаты рэйс" (СССР).
**13.50** Nota Bene.
**14.30** Навіны рэгіёна.
**14.50** "Славянскі базар у Віцебску-2009". Дзённік.
**14.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках "Формула-1". Гран-пры Германіі. Гонка. Прамая трансляцыя.
**16.55** Фантастычны серыял "Паверхня" (ЗША).
**17.50** Суперлато.
**18.45** "Славянскі базар у Віцебску-2009". Дзённік.
**18.50** Меладрама "Рассмяшыць Бога" (Расія).
**20.35** "Спортлато 5 з 36". Забаўляльнае шоў.
**21.00** "Панарама тыдня" з Максімам Кароткіным.
**21.45** "Славянскі базар у Віцебску-2009". Дзённік.
**22.00** "Славянскі базар у Віцебску-2009". Другі конкурсны дзень. Прамая трансляцыя.
**23.20** Прэмія "Оскар". Любоўная драма "Небяспечныя сувязі" (ЗША - Вялікабрытанія).

### АНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: "Нядзельная раніца".
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** "Шчаслівыя разам". Камедыйны серыял.
**09.50** "Шалапутныя нататкі" з Дзмітрыем Крыловым.
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** Жарсці па ежы".
**12.35** "Зваротны адлік". "Горад, паўсталы з попелу".
**13.05** "Людміла Зыкіна. "Я недакахала...".
**14.05** Камедыя "Амазонкі з Беверлі Хілз".
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** "Розыгрыш". Лепшае.
**17.35** "КВЗ". Прэм'ер-ліга.
**19.10** АНТ прадстаўляе: "Рэкламная паўза".
**20.00** Контуры.
**21.05** "Вялікая розніца".
**22.05** Сальма Хайек у фільме "Спытай у пылу".
**00.05-01.50** Цырымонія ўручэння народнай прэміі "Залаты грамафон".

### СТВ

**06.10** "Турысты". Камедыйны серыял.
**07.00** "Сямейнае кіно": "Прыгоды Тома Сойера і Гекльберы Фіна". СССР, 1981 г.
**10.25** "Дабры дзень, доктар!".
**10.55** "Вялікі сняданак".
**11.30** "Аўтапанарама".
**12.00** "Салдаты. Залатыя серыі".
**14.45** "Дарагая перадача".
**15.00** "Культурнае жыццё" з А. Ефрэмавым.
**15.30** "Уваскрэсенне класікі" з Аляксандрам Анісімавым. Дыялогі аб музыцы.
**16.30** "24 гадзіны".
**16.50** "Асабісты інтарэс" з Паўлам Каранеўскім.
**17.10** "Аўтапанарама".
**17.35** "Залатая калекцыя": "Супрацьстаянне". СССР, 1985 г. 2-ая серыя.
**19.30** "Тыдзень". Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм "Мост караля Людовіка Святога".
**22.40** "Спартовы тыдзень".
**23.00** СТБ прадстаўляе: канцэрт Ганны Шарку-новай "Сэрца прыгажуні".
**00.05** "Уцёкі". Серыял.

### ЛАД

**07.55** Мір вашаму дому.
**08.05** Д/с "Сардэчна запрашаем у маю краіну" (Францыя). Заключны фільм.
**08.20** Камедыйна-прыгодніцкі фільм "Па сакрэце ўсяму свету" ("Беларусьфільм"). 2-я серыя.
**09.20** Фантастычны серыял "Філ з будучыні".
**10.10** Анімацыйны фільм "Карлік Нос" (Расія).
**11.30** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**12.05** Пасоўванне +.
**12.20** Прыгодніцкі фільм "Мяцеж на Баунці".
**15.20** Камедыйны серыял "Дурнушка Бэці-2".
**16.50** Меладрама "Ключы ад хаты".
**18.40** Камедыя "10 чыннікаў маёй нянавісці".
**20.25** Тэлебарометр.
**20.45** Экспедыцыя.
**21.15** Моладзевая камедыя "Зяць" (ЗША).
**22.55** "Правы чалавека". Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**23.10** Свая музыка.

### РОССИЯ

**07.00** Фільм "Сам я - вяцкі выхадзец".
**08.40** Фільм "Аповяды аб каханні".
**10.05** "Мой срэбны шар. Ірына Разанава".
**11.00** Весткі.
**11.15** "Сам сабе рэжысёр".
**12.10** Музычны фільм "Вясёлая ўдава". 2-я серыя.
**13.15** Мульфільмы.
**13.30** "Гарадок". Дайджэст.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял "Каменская".
**15.20** "Кінескоп" з Пятром Шэпаціннікам". "31-ы Маскоўскі Міжнародны кінафэст".
**16.10** Фільм "Вандраванне мсье Перышона".
**17.35** "Смяяцца дазваляецца".
**19.00** Весткі тыдні.
**20.05** "Сумленны дэтэктыў". Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**20.45** Камедыя "Бедныя сваякі".
**22.55** Фэст "Славянскі базар - 2009".
**00.00** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** "Дзікі мір" з Цімафеем Бажэнавым.
**08.45** "Іх норавы".
**09.25** " Ядзім дома!".
**10.00** Сёння.
**10.20** "Выратавальнікі".
**10.50** "Змаганне за ўласнасць".
**11.25** "Авіятары".
**12.00** "Дачны адказ".
**13.00** Сёння.
**13.25** "Крамлёўскія пахаванні". Георгій Паўлаў.
**14.10** Камедыя "Уімблдон".
**16.00** Сёння.
**16.20** "Рэпарцёр" А. Зіненка. Лепшыя фільмы.
**17.10** Дэтэктыўны серыял "Закон і парадак. Злачынны намер".
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.50** Максім Фамін, Аляксей Ціткоў у шматсерыйным фільме "Ганчакі: гонка за лідэрам".
**23.35** "Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння".
**00.05** Футбольная ноч.
**00.30** "Асабліва небяспечны!".

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Навіны.
**09.45** Ралі. Ралійная серыя IRC. Выбарг (Расія). Дзень 3.
**10.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Андора ла Вейя - Сэн-Жырон. Андора/Францыя. Этап 8.
**11.45** Веславанне. Кубак свету. Люцэрнаў.
**12.45** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ. Хакенхайм (Германія).
**13.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Сэн-Гадан - Тарб. Францыя. Этап 9.
**18.00** Веславанне. Кубак свету. Люцэрнаў (Швейцарыя).
**19.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету сярод моладзі. Бресанон (Італія). Дзень 5.
**20.45** Мотаспартовы часопіс.
**21.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Навіны.
**21.15** Тэніс. Турнір АТР. Ньюпарт (Вялікабрытанія). Фінал.
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Сэн-Гадан - Тарб. Францыя. Этап 9. Агляд.
**00.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету сярод моладзі. Бресанон (Італія). Дзень 5.
**01.15** Мотаспартовы часопіс.
**01.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Сэн-Гадан - Тарб. Францыя. Этап 9. Агляд.

### БЕЛСАТ tv

**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыя)
**19.15** "Элі Макбіл", тэлесерыял: V сезон, 9 серыя
**20.05** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: "Раскіданы хата", дак. фільм, рэж. Барбара Балiньска, Кшыштаф Калюкін, 1996 г., Польшча
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: "Альгерд" (пазнавальная праграма)
Сын вялікага князя літоўскага Гедзіміна і полацкай князёўны Марыі Яраслаўны падчас свайго княжання больш як удвая павялічыў абшары Вялікага княства. У сваіх бітвах Альгерд перамагаў тэўтонцаў пры рацэ Стрэве, татараў ля Сініх Водаў, адваяваў Смаленскае княства, тройчы хадзіў з паходам на Маскву. Пекла другога шлюбу з цвярской князёўнай Вульянай Аляксандраўнай меў гэтым сыноў, адзін з якіх, Ягайла, стаў польскім каралём, заснаваўшы дынастыю Ягелонаў.
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.45** Фільматэка майстроў: "Начныя здані" (Nachtgestalten), маст. фільм, рэж. Андрэас Дрэзэн, 1999 г., Германія. У ролях: Мірыям Абас, Дамінік Горвіц, Олівэр Бэслер, Зузанэ Борман.
У Берлін прылятае Тата Рымскі, аднак пекла гэтага начны горад не робіцца больш міласэрным так бесхацінцаў. Некалькі бадзягаў: дзядок з афрыканскім хлопчыкам, заможны правінцыял з вулічнаю прастытуткаю - шукаюць сабе прытулку, але ўсе ў гэтую ноч трапляюць ў неверагодныя прыгоды...
Сумныя і смешныя гісторыі розных людзей на тлі начнога жыцця Берліну.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________
(по реестру ф. 11)
№ ____________
(по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.
____________
(сумма прописью)
____________
Кому Куда Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11
От кого ____________
____________
Адрес ____________
(почтовый индекс и подробный адрес)
____________

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
____________
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за июль, август, сентябрь 2007 г. (Ненужное зачеркнуть) | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
____________
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за июль, август, сентябрь 2007 г. (Ненужное зачеркнуть) | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

ГАДАВІНА

# ГЭТА ЗДАРЫЛАСЯ АДНОЙЧЫ ЎНАЧЫ

Іван Біч

**Увага! Гэты артыкул не для гомафобаў. Ён прысвечаны 40-й гадавіне Руху за правы гомасексуалістаў і лесбіянак.**

Крыстафер-стрыт, 53, раён Грынвіч-вілідж, Нью-Йорк. Кавярня “Stonewall Inn”. Менавіта тут 40 гадоў таму прыхільнікі нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі дайшлі да думкі, што яны грамадзяне і павінны змагацца за свае грамадзянскія правы.

Амерыканская камуна геяў і лесбіянак, якая сфармавалася яшчэ пасля другой сусветнай вайны, тым не менш была вельмі забітай. Мужчыны з доўгімі і жанчыны з кароткіміваласамі (так іх называлі на публіцы) старанна хавалі свой сакрэт, вялі падвоеная жыццё, не афішавалі свае забабоны.

Больш таго, у 1950 годзе на хвалі пераследу камуністаў, гомасексуалістаў як людзей з незвычайным стылем жыцця ўлады ўключылі ў спіс небяспечных для грамадства. Пачалася кампанія па выкрыванню падобных элементаў у нацыянальных дзяржаўных органах. За 1950 год прыкладна 4500 чалавек былі вылічаны і пазбаўленыя працы. Амерыканская асацыяцыя псіхіятраў разглядала іх як паталагічна хворых. Лічылася, што арыентацыя хлопчыка або дзяўчынкі звязаная з праблемамі ў сям’і на ранім этапе выхавання. Парадаксальна, аднак справамі геяў, лесбіянак і іх арганізацыямі займалася само ФБР.

Нельга не сказаць, што сексменшасці не абараняліся. Яшчэ ў 1951 годзе яны стварылі ў Каліфорніі сваю асацыяцыю. Аднак урад з імі асабліва не цырымоніўся. У 1958 годзе справу выдаўцоў часопіса, які асвятляў праблемы геяў, разглядаў Вышэйшы суд ЗША.

Пазней адзін гісторык пісаў: “Гэта быў легіён людзей, якіх ігнаравалі, з якіх смяяліся або якіх зневажалі. Іх быццам ніхто не бачыў. У адрозненні ад афраамерыканцаў, жанчын, індзейцаў, яўрэяў, ірландцаў, італьянцаў, іспанамоўных, якія змагаліся за свае правы, гомасексуалісты не мелі мовы або дыялекту, сваіх арганізацый, культурных дэфініцый”.

Адзінай аддушынай для гомасексуалістаў былі бары і кавярні ў багемных кварталах буйных гарадоў, напрыклад “Stonewall Inn” у Нью-Йорку. У 50-я Грынвічвілідж стаў цэнтрам авангарднай субкультуры бітнікаў. Аднак нават тут сітуацыя была напружанай. Рэйды паліцыі па барах, якія звычайна кантралявала мафія, былі даволі частай справай. Усю публіку ў выніку падобнай зачысткі забіралі і цягнулі ў бліжэйшы паліцэйскі пастарунак. Далейшы сцэнар быў наступны: калі ты ў інтарэсах кар’еры, грамадскага і сямейнага статусу не жадаеш, каб у пратаколе было запісана “арыштаваны ў бары для геяў”, давай копам грошы.

Увечары 28 чэрвеня 1969 года праводзілася чарговая зачыстка. Паліцыя ў ходзе рэйду накрыла і “Stonewall Inn”, дзе арыштавала тузін гомасексуалістаў, лесбіянак і аматараў закінуць за каўнер. Арыштаваных пачалі выводзіць на вуліцу і саджаць у паліцэйскі аўтобус. У гэты момант каля ўваходу ў бар сабраўся натоўп. Нехта кінуў у паліцэйскіх пляшку. Потым паляцела яшчэ адна. Потым у ход пайшлі камяні. Паліцыя не чакала такой рэакцыі. Была выкліканая дапамога. Аднак яшчэ 6 дзён квартал быў ахоплены хваляваннямі пад лозунгам “Gay Power!” (“Уладу геям!”).

Падчас пратэстаў узнікла ініцыятыва Gay Liberation Movement (Рух за вызваленне геяў). У выніку праз месяц толькі ў Нью-Йорку пачалі выходзіць тры газеты, прысвечаныя правам сексуальных меншасцяў. Праз пару гадоў былі створаныя нацыянальныя асацыяцыі. Ужо праз год у Лос-Анжэлесе і Нью-Йорку прайшлі першыя масавыя маршы, прысвечаныя падзеям 28 чэрвеня ў Грынвіч-вілідж.

Рух за правы геяў і лесбіянак, а таксама вельмі блізкі да яго рух феміністак, сталі сімваламі 1970-х. Іх уплыў на грамадскія інстытуты ЗША быў вельмі моцны. Ужо ў пачатку 1970-х гэтых людзей перасталі разглядаць як псіхічнахворых. У 1999 годзе ўрад ЗША ўвогуле прызнаў будынкі на Крыстафер-стрыт, дзе знаходзілася кавярня “Stonewall Inn”, аб’ектам гістарычнай спадчыны ЗША. Але згаданыя ініцыятывы выклікалі адпаведную рэакцыю. У ЗША напрыканцы 1970-х сфармаваўся рух супраць актывістаў арганізацый геяў і лесбіянак. Гэты рух мае вельмі моцныя пазіцыі і ўплывае нават на курс цяперашняй прагрэсіўнай адміністрацыі ЗША.




Сёння, падводзячы вынікі 40-гадовай гісторыі, геі і лесбіянкі кажуць, што яны сталі заложнікамі кан’юнктуры. Калі Барак Абама пачаў выбарчую кампанію, яны дружна падтрымалі яго. Падчас кампаніі Абама параўноўваў стан сексменшасцяў з крытычным станам іншых сацыяльных груп, якія падвяргаюцца дыскрымінацыі, напрыклад, жанчын або эмігрантаў. Ён нават абяцаў перагледзець спецыяльнае заканадаўства, якое забараняе геям і лесбіянкам служыць у войску. Другім пунктам Абамы было абяцанне перагледзіць Defence of Marriage Act, які забараняе аднаполым парам выхоўваць прыёмных дзяцей.




Абама на пасадзе прэзідэнта амаль шэсць месяцаў, аднак ніякага прагрэсу ў гэтай галіне няма. Больш таго, дзень уступлення Абамы ў свае паўнамоцтвы стаў сімвалам паразы руху геяў і лесбіянак. У гэты ж дзень на рэферэндуме большасць жыхароў штату Каліфорнія прагаласавала за забарону аднаполых шлюбаў. Як прэзідэнт, Абама мог неяк ацаніць сітуацыю, аднак ён устрымаўся.

Прычыну асцярожных паводзін прэзідэнта ведае кожны, хто цікавіцца палітыкай. Для Абамы вельмі важныя галасы так званага “біблейскага пояса” — выбаршчыкаў кансерватыўных штатаў, кшталту Небраска і Індыяна. Менавіта галасы выбаршчыкаў гэтага рэгіёну сталі адным з галоўных фактараў перамогі кандыдата ад дэмакратаў.

28-га чэрвеня “New York Times” працытаваў Дасціна Блэка (Dustin Black), сцэнарыста “Харві Мілк” (гісторыі пра першага ў ЗША дэпутата-гомасексуаліста), які атрымаў “Оскар”. “У Вашынгтоне лічаць, што дастаткова кідаць гомасексуалістам падачкі, і ўсё будзе нармальна”, — кажа Дасцін. На думку Блэйка, няма ніводнага штату ў ЗША, дзе геі маюць роўныя правы з іншымі людзьмі.

Між тым, у той жа дзень Барак Абама сустрэўся з лідэрамі абшчыны геяў і паабяцаў быць іх адвакатам. Яшчэ раней прэзідэнт назваў падзеі 28 чэрвеня 1969 года “вялікім укладам у дасягненне роўнасці грамадзян перад законам”.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Хаця на дадзены момант Расія і Беларусь перажываюць не лепшыя дні ў сваіх адносінах, 35 працэнтаў расіян вераць, што Саюзная дзяржава як мінімум у цяперашнім выглядзе захаваецца. Яшчэ 15 працэнтаў маюць надзею, што адбудзецца поўнае зліццё ў адну дзяржаву. Праўда, веры ў такое аб’яднанне ў жыхароў краіны ўсё менш і менш. Напрыклад, у 1999 годзе 43 працэнта сцвярджалі, што Расія і Беларусь аб’яднаюцца. Сёння 40 працэнтаў кажуць, што краіны будуць развівацца незалежна, аднак сяброўскія адносіны захаваюцца. У гэтых лічбах няма нічога дзіўнага. З аднаго боку, расійска-беларускія адносіны ўспрымаюцца крытычна, з іншага — жыхары абедзвюх краін ставяцца адзін аднаго прыхільна.

**“Газета.ру” (Расія)**

Такога кшталту заявы расійскага прэм’ера (пра намер і далей падтрымліваць гаспадарку Беларусі) з’яўляюцца па сутнасці жэстам добрай волі і крокам насустрач беларускаму кіраўніцтву пасля напружаных для абедзвюх дзяржаў тыдняў, якія ўмясцілі ў сябе малочную вайну, а потым спрэчкі наконт паставак у Беларусь расійскіх энерганосьбітаў. Дарэчы, патэнцыял канфлікту далёка не вычарпаны. Адначасова сам Лукашэнка заявіў, што эканамічныя канфлікты могуць прывесці да правалу праекта расійска-беларускай Саюзнай дзяржавы. З заявамі беларускага лідэра можна пагадзіцца, аднак праўда і іншае — апошнія палітычныя учынкі Лукашэнкі (у прыватнасці дэманстратыўная гульня з Захадам і ўдзел у відавочна антырасійскай праграме “Усходняе партнёрства”) дрэнна пасуюць намерам будаваць з Расіяй саюз. Не кажучы пра тое, што зацягваецца пытанне прызнання Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

**“Фінтайм” (Расія)**

Еўрапейскі Саюз паставіў умовы: буйныя крэдыты ў абмен на прыватызацыю і продаж еўрапейскім інвестарам галоўных беларускіх прадпрыемстваў. Па інфармацыі выдання “Коммерсант”, яшчэ адным крэдытным патрабаваннем аказалася змена беларускага выбарчага заканадаўства ў адпаведнасці са стандартамі АБСЕ. Прычым заканадаўства павінна быць зьмененае да наступных выбараў. Іншымі словамі, Мінску фактычна прапанавалі выбар паміж супрацоўніцтвам з РФ і ЕС з усімі вынікаючымі наступствамі. Цяпер слова за Лукашэнкам — ён павінен будзе зрабіць няпросты выбар, ад якога будзе залежыць як ягоная палітычная будучыня, так і будучыня 9,5 мільёна беларусаў. З аднаго боку — бестэрміновае прэзідэнцтва, неабмежаваная ўлада і… магчымае банкруцтва краіны або яе здача Расіі. З іншага — адмова ад значнай долі сваёй улады, палітычная пенсія, выратаванне эканомікі і захаванне палітычнай незалежнасці ад РФ. Што і казаць, выбар у Аляксандра Рыгоравіча няпросты, аднак яго трэба будзе рабіць. Часу на тое, каб думаць, практычна не засталося.

**“Мобуньюс” (Украіна)**

Што зараз адбываецца? Трактарны завод у Чэбаксарах знаходзіцца ў катастрафічным стане. Прычым не з прычыны крызісу, а ў выніку таго, што на расійскім рынку трактароў пануюць беларусы. Тое ж самае ў сельскай гаспадарцы. Беларусы яўна дэмпінгуюць. Яны стварылі льготныя ўмовы для сваіх вытворцаў, субсідуюць вытворчасць. А пасля за кошт аб’ёмаў, захопліваючы вялікі расійскі рынак, яны тыя страты кампенсуюць. І атрымліваецца, што расійскі спажывец аплачвае гэтыя схемы, нармальнае існаванне беларускай эканомікі. Гэта не можа цягнуцца вечна.

**“Взгляд” (Расія)**

Рэальны заробак беларусаў (асабліва на прадпрыемствах дзяржсектару) далей будзе падаць, мяркуюць эксперты. Прычым, калі ў рублёвым эквіваленце не значна, то ў доларавым — вельмі адчувальна з-за будучай плаваючай дэвальвацыі рубля. Індэксацыі заробкаў у дзяржаўным сектары, зразумела, не будзе. На думку беларускіх экспертаў, ужо да канца гэтага года ў беларускага зайчыка ёсць усе перадумовы, каб паўтарыць лёс украінскай грыўні, якая з восені мінулага года прасела на 60 працэнтаў адносна долара. Міззэрны аб’ём рэзерваў не дазваляе казаць, што сёння падзенне рубля закончылася.

**“Эксперт” (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УКРАІНА. 75 ГАДОЎ ТАМУ КІЕЎ СТАЎ СТАЛІЦАЙ



Грамадскасць Кіева і Харкава актыўна спрачаецца з нагоды незвычайнага юбілею. Роўна 75 гадоў таму ўрад Украінскай ССР пераехаў з Харкава ў Кіеў. Адпаведна, Кіеў ператварыўся ў галоўны горад рэспублікі. Нагадаем, што Харкаў стаў сталіцай у 1917 годзе. У прынцыпе, бальшавікі нічога асаблівага супраць Кіева не мелі, аднак там засядала Цэнтральная рада. Давялося шукаць альтэрнатыву. Так сталіцай савецкай Украіны стаў Харкаў. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны пераносіць сталіцу не рашыліся: недалёка была мяжа з Польшчай. Аднак да пачатку 1930-х гадоў дыскусія ўнутры партыі на тэму, дзе ж быць сталіцы УССР, зноў ажывілася. Тагачасны кіраўнік украінскай кампартыі выклаў наступныя аргументы за змену рэзідэнцыі ўраду: перанос сталіцы будзе сведчыць, што СССР нікога не баіцца, і дазволіць разбурыць нацыяналістычнае гняздо, якім быў у 1920-я гады Кіеў (тут некалькі разоў раскрываліся змовы петлюраўцаў). Сталін падтрымаў ініцыятыву. Сёння жыхары Кіева гадаюць, што прынёс ім статус сталіцы. Усе пагаджаюцца, што дзякуючы таму горад перажыў сапраўдную мадэрнізацыю і стаў буйным навуковым, прамысловым цэнтрам. З іншага боку, непасрэдным наступствам таго пераносу стала маштабнае разбурэнне гістарычнага цэнтру Кіева, на месцы якога камуністы стварылі ўрадавыя кварталы.

**Па матэрыялах “Україна Молода” (Украіна)**

### ЧЭХІЯ. ВАЦЛАЎ ГАВЭЛ БУДЗЕ РЭЖЫСЁРАМ



Вядомы драматург, былы дысідэнт, а потым прэзідэнт Чэхаславакіі і Чэхіі Вацлаў Гавэл абвясціў, што ў хуткім часе пачне здымаць фільм. У аснову сюжэта карціны будзе пакладзена яго ж п’еса “Адысея”. Яе прэм’ера адбылася ўвесну гэтага года. Драматычны твор распавядае пра тое, як цяжка палітыку вяртацца да звычайнага жыцця пасля таго, як ён перастаў займацца публічнай дзейнасцю. Зразумела, што ў п’есе шмат асабістага: Гавэл з-за палітычных зменаў канца 1980-х амаль на 20 год адклаў свае творчыя планы і пайшоў у палітыку. Па-сапраўднаму ён сышоў з палітыкі ў 2003 годзе. Адпаведна планам Гавэла, здымкі карціны пачнуцца ў наступным годзе. Пакуль што няма інфармацыі, хто будзе іграць ролю галоўнага героя. Затое вядома, хто выканае ролю яго другой паловы. Гэта будзе Дагмара Гавэл, жонка Вацлава, прафесійная актрыса.

**Па матэрыялах “Dzennik” (Польшча)**

### ІСПАНІЯ. ДЫКТАТАРЫ МОГУЦЬ СПАЦЬ СПАКОЙНА



Парламент Іспаніі прыняў закон, які павінен спадабацца дыктатарам і іншым асобам, якія не супраць парушэння правоў чалавека. Раней, адпаведна прынятаму ў 1996 годзе закону, іспанская пракуратура магла распачаць крымінальную справу супраць любой асобы, якая падазравалася ў парушэнні правоў чалавека або генацыдзе, і пераследаваць яе ва ўсім свеце. Праўда, толькі аднойчы асоба, арыштаваная па гэтаму закону, была прыцягнутая да адказнасці. Мова пра аргенцінца Адольфа Сцылінга, які катаваў апазіцыянераў у час вайсковай дыктатуры. Самай вядомай ахвярай таго закона стаў экс-дыктатар Чылі Аўгуста Пiначэт, які ў 1998 годзе прыбыў на лячэнне ў Лондан і быў арыштаваны на просьбе іспанскага пракурора. Пасля Пiначэта адпусцілі. Цяпер у фокусе ўвагі пракуратуры будуць выключна тыя асобы, якія мелі дачыненне да забойстваў або парушэнняў правоў грамадзян Іспаніі або зрабілі свае злачынствы на тэрыторыі Іспаніі. Праўда, усё роўна трэба быць асцярожнымі. Усе ўжо распачатыя справы будуць працягнутыя. Так ці інакш, сем самых буйных праваабарончых арганізацый свету (сярод іх Amnesty International і Human Rights Watch), а таксама прафсаюзы выступілі супраць новага закону. На іх погляд, улады баяцца, што да адказнасці давядзецца прыцягваць некаторых міністраў былой адміністрацыі Джорджа Буша, якія санкцыянавалі катаванні вязняў турмы Гуантанама.

**Па матэрыялах “Junge Welt” (Германія)**

ЦІКАВА

# МАЙКЛ ДЖЭКСАН — ЗДРАДНІК, ГЕНІЙ ЦІ ІСЛАМСКІ РАДЫКАЛ?

*Алег Пятроў*

**Чорная Амерыка горача спрачаецца, якое месца заняў нябожчык Майкл Джэксан у яе гісторыі.**



Яшчэ дзесяць гадоў таму ніякіх спрэчак на гэты конт не было. Майкл Джэксан, хлопчык з працоўнай сям’і, зрабіў сапраўдную культурную рэвалюцыю. Сваім талентам разбурыў векавыя расавыя інстытуты і клішэ.

Джэксан пачынаў сваю кар’еру ў групе “Jackson Five”, дзе спяваў разам са сваімі братамі ў стылі соул. Групу падтрымлівала кампанія “Motown Records” — адзіная на той час фірма ў Штатах, якая працавала з чарнаскурымі музыкамі. Аднак поспех “Jackson Five”



быў настолькі відавочны, што іх пачалі слухаць не толькі ў чорным гета. У 1972 годзе Філ Карлсан узяў запісы “Jackson Five” для першага ў ЗША фільма, дзе галоўныя ролі ігралі толькі чарнаскурыя артысты. Мова пра карціну “Бені”. Фільм заклаў цэлую індустрыю чорнага кіно.

Майкл пайшоў далей як сольны артыст. Наступны крок — прарыў на канал MTV. Гэты канал называлі інстытутам культурнага апартэіду, бо адзін з заснавальнікаў каналу Роберт Пітман лічыў, што тут не месца для культурнага плюралізму. І нарэшце 1982 год — выхад альбому “Triller”. Ніводны альбом дасюль не пабіў яго рэкорд папулярнасці. Рональд Рэйган у знак павагі да артыста запрасіў яго ў Белы дом.

Здавалася б, Майкл пасля ўсяго гэтага павінен выглядаць ідалам у вачах чорнай Амерыкі. Але не. Напрыканцы 1970-х прадзюсер Роні Алексенбург прапанаваў Джэксану перайсці з “Motown Records” на музычную фірму CBS, якая працавала з першымі зоркамі поп-музыкі. Пры гэтым ён паставіў Майклу ўмову: паступова адмаўляцца ад элементаў традыцыйнай чорнай музыкі, стылю паводзін чорнага артыста на сцэне і г. д. Джэксан прадаў душу. Пагадзіўся парваць з каранямі.

З часам ён пажадаў нават знешне выглядаць як белы — пачаў асвятляць сабе скуру, рабіць пластычныя аперацыі. Адзін з хірургаў-дэрматолагаў, які праводзіў яму аперацыю па асвятленні, распавёў, што нават белай скуры было Джэксану замала. Ён прасіў, каб яму, напрыклад, зрабілі меншым нос.

Асвятленне скуры — гэта не проста капрыз у вачах простага афраамерыканца. Гэта адмова ад культуры “black pride” (“гонар за чорнае”), папулярнай сярод афраамерыканцаў у 1970-я. “Black pride” быў нечым кшталту пратэсту для чорных у ЗША. Дарэчы, моду ганарыцца сваім колерам скуры прыдумаў Джон Браўн, заснавальнік стылю соул, якога Джэксан называў сваім кумірам і бацькам. Атрымліваецца, што ён і бацьку прадаў.

Нарэшце, лад жыцця, які вяла зорка, выклікаў у актывістаў чорнага руху проста шок. Трэба адзначыць, што чорны Поўдзень вельмі кансерватыўны і моцна прытрымліваецца хрысціянскіх маральных каштоўнасцяў. А тое, чым займаўся Джэксан, мала адпавядала гэтым каштоўнасцям. Майкл пабудаваў сабе нешта кшталту Дыснэй-парка, дзе збіраў калекцыю цацак і жывёл. У дадатак яго падазравалі ў сексуальных дамаганнях да 13-гадовага хлопчыка.

Хутка нават амерыканскія комікі ахвотна смяяліся з Джэксана, прадстаўляючы яго як белую жанчыну — ахвяру шматлікіх хірургічных аперацый. Джэксан аднaзначна перастаў быць іконай для чорнай супольнасці.

Яго нечаканая трагічная смерць прымусіла гісторыкаў і палітыкаў больш асцярожна падысці да яго асобы і спадчыны. Паспрабаваць знайсці ў Майкле пазітыў.

Пачнём з таго, што ў любым выпадку чорная Амерыка, здаецца, прабачыла спеваку не вельмі прыстойны старонкі ягонай біяграфіі. Як толькі стала вядома пра смерць артыста, каля Apolo Theatre у цэнтры чарнаскурага кварталу Гарлем у Нью-Йорку пачаў збірацца натоўп. Вуліцы запоўнілі тысячы маладых людзей. Пад партрэтам Джэксана стаялі сотні свечак.

Для простых афраамерыканцаў была больш істотнай роля, якую адыграў Джэксан у гісторыі чорнай музыкі. За час сваёй творчасці ён развіў гэты жанр, стварыў фактычна новую сцэну, даў вялікі штуршок маладым людзям займацца творчасцю. Як заявіў Марк Морыял, былы мэр Новага Арлеану, адзін з лідэраў руху за правы афраамерыканцаў, падчас спантаннага мітынгу ў гонар нябожчыка: “Ён (Джэксан) зрабіў у музыцы тое, што Барак Абама — у палітыцы”.

Яшчэ адзін цікавы нюанс: Джэксан, які сышоў у вялікі шоў-бізнес, адчыніў для афраамерыканскіх музыкаў прастор, даказаў ім, што трэба эксперыментаваць, а не заставацца ў рамках і стандартах традыцыйнай чорнай музыкі.

І нарэшце, ёсць меркаванне, што Джэксан абсалютна не цураўся ўдзелу ў руху чорных. Невядомай старонкай жыцця Майкла ёсць ягоныя кантакты з радыкальнымі чорнымі фундаменталістамі з арганізацыі “Нацыя ісламу”. Кантакты адбываліся ў 2003 годзе, літаральна адразу пасля таго, як Майкла абвінавацілі ў педафіліі.

Дарэчы, групоўка выступае за стварэнне асобнай ісламскай дзяржавы для афраамерыканцаў. Дасюль невядома: ці то артыст першым пайшоў на кантакт з фундаменталістамі, ці яны самі выйшлі на яго. Вядома толькі, што нейкі час іх адносіны былі вельмі шчыльнымі. Прэса нават пісала, што Джэксан збіраецца перадаць Луісу Фарахану, кіраўніку арганізацыі, права распараджацца сваімі капіталамі.

Сёння некаторыя выданні пішуць, што, магчыма, занадта блізкія адносіны з радыкаламі і былі прычынай смерці спевака.

КАМЕНТАР

# GAME IS OVER

**Алег Новікаў**

**Хутчэй скептыцызм і песімізм, чым прылiў радасці выклікала ў простых расіян рашэнне ўрада пра забарону з 1 ліпеня дзейнасці ў краіне (акрамя чатырох рэгіёнаў) усіх казіно і залаў гульнявых аўтаматаў. Прапануем падборку каментараў на расійскіх блогах, прысвечаных згаданай праблеме.**



— З 1 ліпеня пазачынялі ўсе казіно і гульнявыя аўтаматы. Колькі ж цяпер іграманаў стануць вар'ятамі?

— За кожным гульнявым аўтаматам або сталом цягнецца шлейф слёз, крыві і зламаных лёсаў — не менш, чым за гандляром наркотыкамі або гвалтаўнiком дзяцей. І месца гэтаму бізнесу, у крайнім выпадку, у крымінальных хроніках, а яго прадстаўнікам — у пекле. Толькі б улады не зламаліся пад ціскам тых, хто корміцца аб'едкамі са стала канібалаў.

— Сённяшнія СМІ мільгацяць сюжэтамі пра зачыненне гульнявых установаў. Адны страшаць, што зараз Маскву захлынуць нелегальныя казіно, другія думаюць, куды пойдуць працаваць 11,5 тысячы працаўнікоў забароненай цяпер індустрыі, ну а трэція разважаюць, як жа так атрымалася, што ў гульнявых зонах, якіх, як вядома, дзяржавай вызначана аж чатыры штукі, замест Лас-Вегасу стаяць хаціны, дзе бухаюць тубыльцы, якія не тое што пра казіно, пра рулетку ніколі не чулі. Тым часам самыя хітрыя бізнесмены ад рулеткі даўно ўжо заявілі нешта кшталту: ну і што. Зараз мы зробім на базе казіно клубы спартовага покера (гульня не за грошы). Папросту ў нейкі момант да сталага кліента будзе падыходзіць менеджэр і шэптам прапанаваць перайсці ў "VIP-залу" — там, дзе гуляюць на грошы. Ха-ха. Не думаю, што ўлады прадбачылі маштаб хуткага правалу іх ініцыятывы.

— Думаю, выйграюць у гэтай барацьбе толькі мянты, менавіта яны будуць "брацц пад ахову" нелегальныя казіно. А ў Маскве падобнае страхаванне даўно пастаўлена на канвеер. Выйсця няма.

— Сёння ў РФ зачыняюць казіно і іншыя падобныя ўстановы. Вельмі цікава — як гэта забарона будзе абыдзеная (а ў тым, што будзе, здаецца, ніхто не сумняваецца). Мне пакуль вядомыя два спосабы: 1) інтэрнэт-казіно, дакладней, нібы інтэрнэт-салон, у якім даюць доступ да віртуальнага казіно за межамі РФ; 2) аўтаматы па продажу маментальных латарэяў — замена гульнявым слупкам і аднарукім бандытам.

— Распавяду вам горкую гісторыю аднаго студэнта, вялікага аматара гульнявых аўтаматаў, якую я пачула некалькі гадоў таму. Пачалося ўсё з таго, што пры першай гульні ён выйграў вельмі буйную суму. Збіраючыся выйграць яшчэ, ён зноў пайшоў да аўтаматаў, але прайграў амаль усё. Жадаючы вярнуць згубленае, ён стаў усё актыўней гуляць. Паступова ён літаральна прырос да аўтаматаў. Напачатку ён прайграў усе свае грошы, потым залез у кішэні сяброў-аднакурснікаў, пасля абабраў як ліпку бацькоў. За некалькі гадоў ён прайграў столькі, колькі немагчыма зарабіць нават за ўсё жыццё. Зразумеўшы гэта, няшчасны студэнт скончыў жыццё самагубствам. Ну што, ёсць над чым задумацца?

— 11,5 тысячы былых супрацоўнікаў казіно не шкада. Тыя, хто сапраўды быў прафесійным круп'е, працу атрымае без праблем у тых жа "белых" покерных клубах. Дзяўчынкі і хлопчыкі, якія абслугоўвалі гульцоў — "здымалі" выйгрыш, стаялі на ахове — у большасці сваёй, нікчэмныя лайдакі, якія, па-першае, нічога не ўмеюць, па-другое, атрымлівалі акрамя зарплаты чаявыя — сакрэтнае правіла дзесяці працэнтаў працавала і тут. Ну гэта так, дробязі. І зараз гэтым вось дзецям "Дома–2" прапанавалі цывілізаваную працу адпаведна іх кваліфікацыі — палацёры, афіцыянты, вахцёры, ахоўнікі. Вядома, калі дзеці ўбачылі, чаго насамрэч вартая іх праца, зямля пад іх нагамі трохі пахіснулася.

— Мне вельмі цікава, хто і — самае галоўнае — як змог зачыніць усе аўтаматы і казіно ў Маскве? На Арбаце ўсё зачынена. Гэта велізарныя грошы, якія ішлі ў кішэні ўсім, пачынаючы ад простых мянтоў і заканчваючы службоўцамі рознага рангу і ўзроўню. Хто пазбавіў велізарнага прыбытку ўсе гэтыя пласты насельніцтва? Мне здаецца, яму ўжо зламалі ногі... а можа, яго няма ў жывых? Асабіста я рэальна не разумею. А будзе пасля гэтага вось што — уздымуць падаткі або плату за праезд. Грошы вяртаць трэба. Гэта капец.

— Наколькі мне вядома, сёння ўначы праходзілі развітальныя вечарыны ў казіно. Я адразу падумаў: трэба ў апошні раз паспрабаваць нарубіць бабло!

— Думаю, рызыкоўныя людзі заўсёды знойдуць і прыдумаюць, дзе і ў што гуляць. Тыя, хто сябе кантралявацъ не здольны, вынайдуць спосабы спусціць грошы, хоць усе гульні афіцыйна пазачыняй і забарані. Хіба гульнявы аўтамат прынцыпова адрозніваецца ад ранейшай цягі да якога-небудзь "Спортлато" ці латарэяў, на якія іншыя грамадзяне прасаджвалі ледзь не ўсю зарплату? Гэта ў чалавечай натуры, глыбіннае — уся гісторыя пацвярджае. Зараз багатыя пачнуць дзеля гульняў катацца ў замежжа, а бедным давядзецца ісці на кватэры і ў іншыя падпольныя прытоны.

— Не скажу, што я прыхільнік казіно і гульнявых аўтаматаў, але тупыя рашэнні раздражняюць, а іх усё больш і больш! Накшталт зачынення Чаркізаўскага рынку. Хацелі як лепш, атрымалася — як заўсёды.

— Еxаў я ў машыне, слухаў навіны. Гутарка ішла пра зачыненне з сённяшняга дня ўсіх казіно. Раптам дыктар кажа, што айчынныя псіхіятры і нарколагі чакаюць ад дзеяння закона небывалага наплыву кліентаў, чаму вельмі рады. Адразу ж у эфір утыкаюць словы нейкай цёткі з інстытута Сербскага, якая, захлынаючыся ад радасці, распавяла, як доўга яны чакалі гэтага дня і як зараз яны весела зажывуць. Тыпу таго, што зараз залежным іграманам будзе няма дзе задавальняць свой згубны запал, і яны пачнуць штосьці шукаць. А тут ім і дапамогуць нарколагі. Уяўляю, які жах сёння будзе ў інстытуце Сербскага.

— Дарэчы, калі хто цешыцца, што з сённяшняга дня не будзе гульнявых аўтаматаў, то не разлічвайце... Усё назавуць іншымі імёнамі, кшталту лато.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### АРКАДЗЬ ЧАРНЕЦКІ



Мэр былога Свярдлоўска, а зараз Екацярынбурга, пачаў барацьбу за тое, каб падпарадкаваны яму горад меў статус Трэцяй сталіцы Расіі. Прадстаўнік гарадской адміністрацыі выступіў з сенсацыйнай заявай: Казань, якая раней запатэнтавала назву "Трэцяя сталіца", на самай справе не можа быць уладальнікам падобнага гандлёвага знаку. Аказваецца, у Екацярынбургу даўно існуе прадпрыемства ОАО «Хладокомбинат Норд», якое яшчэ ў 2003 годзе зарэгістравала марку марожанага "Трэцяя сталіца". Правa на марку было аформлена па ўсіх правілах. Такім чынам, Казань, па логіцы закону, павінна перадаць свае правы вытворцам марожанага. Аднак у Казані ёсць свае юрысты, якія заявілі, што правa на "Трэцюю сталіцу" не аддадуць, паколькі ўральскія марожаншчыкі не маюць права выкарыстоўваць брэнд у такой сферы дзейнасці, як рэклама або маркетынг (хаця менавіта для прыцягнення сродкаў Казані і трэба назва "Трэцяя сталіца"). Аднак на гэтым гісторыя наўрад ці закончыцца. Па-першае, нядаўна у Екацярынбургу адбыўся саміт арганізацыі ШОС, і Дзмітрый Мядзведзеў адзначыў добрую арганізацыю мерапрыемства і пахваліў стан гарадской інфраструктуры. Магчыма, гэта ацэнка стане важным аргументам у барацьбе ўральцаў супраць татар. Між тым, на Екацярынбургу і Казані спіс гарадоў, якія хочуць называцца Трэцяй сталіцай Расіі, не заканчваецца. Кіраўніцтва Ніжняга Ноўгарада ўжо паведаміла пра намер адсудзіць тытул у Казані.

### УДА ФОЙГТ



Старшыня вядучай нямецкай праварадыкальнай Нацыянал-дэмакратычнай партыі (NPD) — не адзіны палітык, які лічыць сябе лідэрам германцаў. Ёсць яшчэ ў ФРГ такі Герхард Фрэй, які кіруе Нямецкім народным саюзам (DVU). Нягледзячы на быццам бы адзінства поглядаў (абедзве партыі выступаюць за рэабілітацыю нацызму і будаўніцтва Германіі на прынцыпах кансерватызму і нацыяналізму) Фойгт і Фрэй доўгі час былі як кошка з сабакам. Нарэшце ў 2004 годзе яны вырашылі замірыцца і падпісалі так званы "Пакт Германія". Самы важны пункт дакумента гаворыць пра тое, што, калі па якой-небудзь выбарчай акрузе балатуецца адна партыя, другая не выстаўляе сваіх кандыдатаў. Партыі імкнуліся прытрымлівацца дамовы. Аднак хутка нацыянал-дэмакраты, якія прайшлі ў зямельныя і мясцовыя парламенты на тэрыторыі былой ГДР, пачалі глядзець на саюзнікаў коса. І вось нарэшце ў нядзелю Фойгт заявіў, што ён і ягоныя паплечнікі выходзяць з Пакту. Нацыянал-дэмакраты на выбары ў парламент зямлі Брандэнбург дакладна будуць ісці асобна. Асноўная прычына, па словах Фойгта, — няма сэнсу будаваць кааліцыі з лузерамі. У якасці доказу свайго тэзісу ён прывёў вынікі апошніх выбараў у Еўрапарламент. На іх Нямецкі народны саюз атрымаў усяго 0,3 працэнта галасоў. Цікавай была рэакцыя з боку DVU. Ягоны прадстаўнік назваў учынак Фойгта здрадай. "Сёння Фойгт здрадзіў сябрам па кааліцыі, заўтра прадасць сяброў NPD", — сказаў ён. Між тым, са спасылкай на крыніцы ў МУС, газеты пішуць, што напярэдадні Фойгт ультыматыўна прапанаваў Фрэю ўступіць усёй партыяй у NPD. Застаецца сказаць, што выбары ў Брандэнбургу адбудуцца 27 верасня.

### ЙОШКА ФІШЭР



Былы міністр замежных спраў Германіі, адзін з лідэраў Партыі зялёных, паўтарыў шлях свайго боса па ўраду Герхарда Шродэра. Апошні, як вядома, пасля заканчэння сваёй палітычнай кар'еры падаўся працаваць на "Газпрам" і лабіраваць будаўніцтва газаправоду па дну Балтыйскага мора. Фішэр таксама стаў лабістам. Цяпер ён будзе кансультаваць кіраўніцтва кампаніі, якая будуе газапровад на поўдні. Газапровад называецца Nabucco, і ў выпадку рэалізацыі праекту дазволіць ажыццяўляць пастаўкі туркменскага газу ў Еўропу. Учынак Фішэра выклікаў цікавую рэакцыю ў Партыі зялёных, якія лічаць, што ён фактычна здрадзіў сваім прынцыпам. Аднак іншыя кажуць, што Фішэр застаўся верным сваім перакананням. Яны звяртаюць увагу на тое, што праект Nabucco цалкам адпавядае палітычным поглядам Фішэра, які ў час свайго міністэрства праводзіў паслядоўна антырасійскі курс. Калі Nabucco ўступіць у эксплуатацыю, залежнасць Еўропы ад расійскага газу і, адпаведна, ціску Крамля стане значна меншай.

▸ ТАЯМНІЦЫ ГІСТОРЫІ

# ВЕРШНІКІ НА КОНЯХ. ПРАБЛЕМА ВЫБАРУ

◂ **Заканчэнне. Пачатак у № 22.**

**“Не торгайся, князь… Я ж акрамя ўсяго і ведзьма, прарочыца — ты не ведаў?.. Вось што будзе з табой. Адна жонка, з Сапегаў, ужо ўцякла ад цябе. Жанчыны любяць тыранаў, але толькі не скупых, не халодных і не нудных, як свіная чума. Уцячэ і другая. І трэцяя. І ўсе — з вялікаю ганьбай для цябе, напладзіўшы табе сотні ворагаў. Ты будзеш пасмешышчам нават у вачах бяссілых і садамітаў. І ні ад адной бабы ў цябе не будзе дзяцей, бо Бог праклянe чэрава кожнай жанчыны на час, калі яна з табой… І ўсе будуць бегчы ад цябе, як бягуць з дома — нават калі дом гэты замак — пацукі ад пацука, якога злавілі, вымазалі дзёгцем і выпусцілі. І ты будзеш блукаць адзін бясконцымі замкавымі калідорамі і сутарэннямі, дзе шкілеты замучаных, і ніхто не падасць вады…”**

Гэта прарочыя словы маці зацкаванага на смерць сабакамі Васіля Ветра, удзельніка Крычаўскага сялянскага паўстання 1740–1744 гадоў, адрасаваныя князю Гераніму Фларыяну Радзівілу. Так заканчваецца апошняя гістарычная драма Уладзіміра Караткевіча “Маці Урагану”, узнёслы рэквіем сотням людзей, асуджаным на лютую смерць.

## «Зладзействамі вядомы Радзівіл»

Тым героем, які наважыўся адзначыць сябе конным помнікам пры жыцці, быў Геранім Фларыян Радзівіл (1715–1760), падчашы (1739) і харунжы (1750), пяты гаспадар “на Белай”, шыкоўным замку, парэшткі якога засталіся на землях, што пасля апошняй вайны ўвайшлі ў склад сучаснай Польшчы. Каб зразумець фінансавыя магчымасці гэтага магната, сына канцлера ВКЛ Караля Станіслава і Ганны Кацярыны з Сангушкаў, трэба прыгадаць пра атрыманую ім незлічоную маёмасную спадчыну. Так званую нейбурскую спадчыну па Людавіцы Караліне Радзівіл, памерлай у 1695 годзе ў Германіі.

А ўспадкаеміў ён ні больш ні менш як усю беларускую маёмасць Біржайскай лініі Радзівілаў, пазасталую па знакамітым Багуславе, “антыгероі” сянкевічавага “Патопу” — Біржы, Слуцк, Алыку, вялізныя землі ў Літве, Беларусі і Украіне. Так 20-гадовы Геранім Фларыян, дзякуючы намаганням прадпрымальнай Ганны Кацярыны, вядомай фундатаркі шматлікіх радзівілаўскіх мануфактурных вытворчасцяў улучна са знакамітымі персіярнямі, фарфурнямі і шклянымі вытворчасцямі, зрабіўся найбагацейшым беларускім землеўласнікам.



Партрэт Гераніма Фларыяна Радзівіла. Майстэрня Гірша Ляйбовіча, сяр. XVIII ст. Медзярыт

Папраўдзе, клопаты маці пра лёс сына мелі дваістыя вынікі, як і яе шчыльная апека, з-пад якой Геранім Фларыян уцёк толькі ў 30-гадовым узросце. Асаблівасці выхавання і ўласныя схільнасці прывялі да фармавання аднаго з самых дзіўных, неадназначных і брутальных персанажаў беларускай гісторыі. Мары пра ўласную веліч, якую ён спрабаваў увасобіць сродкамі мастацтва, спалучаліся з жорсткім дэспатызмам і патрабаваннямі дысцыпліны з-пад палкі і да сямейнікаў, і да атачэння, і да слуг.

Юзаф Ігнацы Крашэўскі, польскі пісьменнік і гісторык XIX стагоддзя, у сваёй аповесці “У бельскім замку” і іншых творах, падобна як і Караткевіч, не шкадаваў для нашага героя змрочных фарбаў: стогны кінутых у вязніцу ахвяраў, маўляў, падаючца яму лепшымі песнямі. “На Русі зладзействамі вядомы канеўскі стараста Патоцкі, на Літве — Радзівіл…” Крашэўскі перабольшваў нязначна.

## Жонканенавіснік

Падазронасць, недаверлівасць адбіліся і ва ўласнаручных запісах “Дзённікаў” і “Vademecum” — тастаменце для сваякоў, напісаным перад смерцю. Князь раіць мець недавер да



Манумент курфюрсту Фрыдрыху Вільгельму ІІ (1696–1709), Берлін

ўсіх, асабліва пазбягаць уплыву жанчын, “каб не вадзілі за нос, як індыка”. Апошнія плацілі яму ўзаемнасцю: першыя дзве жонкі, Тэрэза з Сапегаў і Магдалена з Чапскіх, збеглі ад яго хутка, адна Анэля з Мянчынскіх ад шлюбных повезяў вызвалілася толькі праз пяць год праз ягоную смерць…




Уласны малюнак Гераніма Радзівіла

“Бойся няверных слуг і асцерагайся п’янства”, — пісаў гэты бадай самы цвярозы з Радзівілаў — і пазбягаў удзелу ў сойміках і публічных з’ездах шляхты. Замкнёны, ён тым не менш не адкідаў думкі пра асабісты палітычны ўзлёт, праз усё жыццё звяртаючы ўвагу на знакі свайго вышэйшага прызначэння: прынамсі ён лічыў сябе вартым кандыдатавання на каралеўскі трон.

Адукацыю ж раіў атрымліваць своечасова, але не за мяжой, а на радзіме, і лепш у манахаўпіяраў. І ў Белай, і ў Слуцку дзеля асветы меліся вялікія бібліятэкі: пасля перавозу іх у Нясвіж па яго смерці тамтэйшы кнігазбор вырас прыкладна на 8 тысяч тамоў. Сам князь, аднак, здзейсніў адукацыйнае падарожжа па еўрапейскіх краінах у першай палове 1730-х, прывёзшы дамоў валоданне нямецкай мовай і ўсёабдымнае захапленне прускай культурай.

## Гістарычна-тэатральная канва

Скрупулёзна вывучаючы гістарычную канву для напісання “Маці ўрагану”, Караткевіч дасла ў п’есе прэамбулу — “характарыстыкі некаторых гістарычных асоб п’есы, зробленыя для актораў… па максімальна дакладнай гістарычнай канве”.



Якуб Вессэль. Партрэт Гераніма Фларыяна Радзівіла. Каля 1746. Алей

І партрэт Гераніма Фларыяна надта не прывабны — злы і пераважна пануры дэспат, які ў п’есе смяецца толькі двойчы — і ў жыцці хіба не часцей. Зусім не такі, як у парадным адлюстраванні 1746 года Якуба Вессэля, гданьскага партрэтыста высокага стылю, дзе князь адлюстраваны ў традыцыях каралеўскага прадстаўнічага кантэрфекта. Парадны камзол-жусакор з залатым шытвом, ускінутая рука з жазлом, на заднім плане — парад кавалерыі.

У апошняй дэталі адбілася сапраўднае захапленне бельска-слуцкага князя — уласнае войска, лікам да 6 тысяч, і апрача пяхоты — артылерыя, кавалерыя, спецыяльныя янычарскія харугвы ў Белай і Слуцку. І ўласная ахова — мушкецёры, на ўзор французскага манарха. А каб папаўняць службу са сваіх, адданых афіцэраў — “kadetenhaus”, школа кадэтаў у Белай з 1750 года, улучаючы выхаванне кадэтак. І дамінаванне ўлюбёных прусакаў і курляндцаў на службе, бо “халопы не вартыя даверу”. Следам за Караткевічам зазначым — князь — дзеля сябе “разумны і не баязлівец” (у 1752 годзе, скажам, зваліў за месяц 26 мядзведзяў, 17 дзікоў і 126 ваўкоў).

А каб яго інтарэсы засяроджваліся выключна на артыстычных захапленнях, ён, магчыма, увайшоў у гісторыю як станоўчая асоба… Толькі ў Слуцку ў 1750-я гады дзейнічалі акторы з Вены і Дрэздэна, Кёнігсберга і Торуні. Цэлая балетная трупа з Вены з балетмайстрам Пуціні. Музыкі складалі некалькі ансамбляў: італьянскі і венска-чэшскі, камерны, янычарскай музыкі і гарнізонную капэлу. У Слуцку выступаў не толькі балет, дзе працаваў яшчэ адзін блатмайстар Максімільян Дзюпрэ, але і арганізаваўся набор таленавітых дзетак мяшчан у балетную школу, тры танцавальныя пары, з якіх асабліва праславілася танцорка Міхневіч. Дзейнічалі кампазітары (немец Мейер, Юзэф Когут, Францішак Віттман).

З 1752 па 1760 гады пастаўлены 10 п’ес на італьянскай і нямецкай мове, 30 тэатральных вечарын — у асноўных оперных жанрах: камічныя оперы і інтэрмецца. Ёсць звесткі пра пастаноўкі камедыі дэль артэ, выкарыстанне лялечнага тэатра і тэатра ценяў. На ўпрыгожанне тэатру працуюць шкляныя мануфактуры ў Налібоках і Урэччы, ткацкія ў Карэлічах і Слуцку. Шыкоўны замак у Белай даведзены да бляску яшчэ маці, Ганнай з Сангушкаў, а ў Слуцку тэатр быў афармлены пры Гераніме Фларыяне і, як выглядаў, па яго словах, дыхтоўна: “зала для опер і камедый, цудоўна ўладкаваная, уся ў люстрах, у партэры лавы абабітыя мяккім сукном, на лепшых месцах — дыван пунсовага аксаміту”… Дэкарацыі падчас спектакля мяняліся, аркестравая яма месціла 40 музыкаў. Як у варшаўскіх Лазенках, планаваліся павільёны і тэатр паблізу вады — няздзейснены праект “Малой Венецыі” на возеры Княжмор пад Слуцкам.



Партрэт Людавікі Караліны Радзівіл. Майстэрня Гірша Ляйбовіча, сяр. XVIII ст. Медзярыт

## Вораг усім

Дарэмна казаць, што пыха і раскоша двара патрабавала фантастычных выдаткаў і няшчаднай эксплуатацыі сялян, дзейсным інструментам якой былі арандатары: іх мала клапаціў далейшы лёс тых, хто аддаваў апошнія грошы… Так і выбухнула крычаўскае паўстанне.

Але ж цярпела ад пільнага княжацкага кантролю і ўся ягоная служба. Таму шматлікія дакументы сведчаць: ад Радзівіла ўцякалі і ягоныя афіцэры, і служкі, і мастакі-рамеснікі. Брутальныя пагоні з сотнямі вайскоўцаў за збеглымі, і не менш брутальны вынас “паказальных пакаранняў”

на тэатральную сцэну: у 1756 годзе дэманстраваўся эпізод з павешаннем афіцэраў з Белай.

Захавалася перапіска з князем аднаго з яго лепшых мастакоў Стэфана Цыбульскага, які быў накіраваны на навучанне да прыгаданага маэстра Якуба Весселя. Па вяртанні на доўгія месяцы мастак трапіў у кайданы і турму за спробы ўцёкаў — князь баяўся страціць укладзеныя сродкі. Пішучы князю прыніжаны ліст і пералічваючы свае здольнасці — рабіў па загадзе князя і рэстаўрацыю, і маляванне абразоў, і партрэты, і жывапіс у залах, — Цыбульскі не просіць павышэння заробку, 200 злотых (“што маю з рэспекту міласцівага майго на адзенне грэшнага цела”), якія не ведае, на каго “справіць”, сябе, жонку ці дзіцёнка… Просіць толькі найдрабнейшай свабоды, каб можна было “выехаць ці выйсці без спецыяльнага ардынансу”.

### Помнік самому сабе

Празмерны кантроль і рэгуляванне загубілі і праект коннага манумента з чатырма фантанамі вакол, які ў двух рэпліках, для Слуцка (дзе мусіў паўстаць на цэнтральнай плошчы горада) і Белай, пачаў планаваць у 1750-я гады некаранаваны кароль Літвы. У лісце ад 13 ліпеня 1755 года, пісаным з Урэчча да каменданта замка ў Белай Шылінга, захаваўся ўласнаручны малюнак Геранімa Фларыяна — для скульптара-немца, які разам з архітэктарам Краузе ўжо пачаў працы ў Белай.

Якія ж узоры бачыліся Гераніму Фларыяну ў думках пра ўзвядзенне манумента? У часы Яна III Сабескага, калі бацька героя аповеду Караль Станіслаў атрымаў тытул падканцлера ВКЛ (1690), на замову кіраўніка Рэчы Паспалітай працаваў, спачатку ў Львове, а потым у варшаўскай рэзідэнцыі Вілянаў (дзе выканаў выдатныя рэльефы), адзін з выбітных майстроў свайго часу — Андрэас Шлютэр (1660–1714), данцыгскі немец, а ў мастацтве — паслядоўнік Дж. Л. Берніні. Тыя, хто наведваў Пецярбург, могуць прыгадаць і яго кампазіцыі ў гонар выхаду Расіі да Балтыйскага мора, якія ён выканаў для Летняга палаца ўжо на замову Пятра I (1713–1714).

Але найбольш вядомая праца майстра — конны манумент курфюрсту Фрыдрыху Вільгельму II (1696–1709), які ўпрыгожвае двор палаца Шарлотэнбург у Берліне. Тут, у Берліне, Шлютэр ачольваў пэўны час Акадэмію мастацтваў. Работа Шлютэра — шэдэўр манументальнай пластыкі барока. На манументе курфюрст у антычным адзенні, але парыку XVII стагоддзя, узвышаецца на кані над алегарычнымі постацямі скораных ворагаў па кутах пастамента. Вось тая веліч і моц, створаная сродкамі геніяльнага мастацтва, якая вабіла амбітнага ўладара Белай і Слуцка. Твор, вядомы князю, паслужыў і прататыпам планаванага помніка самому сабе.

### Няздзейснены праект

Вось ён перад намі — конь у велічнай спакойнай хадзе з прыўзнятай нагою, вершнік у рымскіх латах і антычным шлеме з плюмажам, з ляскай-рэгіментам у правай руцэ.

У некалькіх лістах у 1755 года да каменданта Шылінга князь загадвае забяспечыць майстра ўсім неабходным, цікавіцца спецыфікацыяй лістоў медзі, якія трэба замовіць, загадвае выкарыстаць “катляра Навотнага” дзеля вырабу радзівілаўскага фамільнага герба, арла, які мусіць размясціцца пад статуяй. Ідуць драбязговыя парады, князь загадвае сачыць “за прапорцыяй”, раіць, як трэба распілаваць статую дзеля ўмацавання элементаў — найбольш папулярная тэхналогія тых часоў прадугледжвала выраб полай скульптуры з металічных пласцін, абабітых па форме драўлянага першаўзору. Дробныя заўвагі, парады, і такая тыповая для Геранімa Радзівіла зачэпка: сачыць, каб “сніцару тамтэйшаму не даць на міласць Бога распіцца…”

Працы пачаліся, і паўстаў драўляны праект, і падрыхтаваны матэрыялы. Але, па іроніі лёсу, аднаго дня князь, на той час выехаўшы з Белай, атрымаў ад каменданта ліст — са звесткамі, што скульптар выехаў без папярэджання. А перад ад’ездам нахабна казаў, што “ягамосць пан” нічога ў апрацоўцы і якасці металічных пласцін не разумее. Душа мастака не вытрывала…

Гісторыкі сцвярджаюць, што ў сярэдзіне XVIII стагоддзя сукупныя даходы з валоданняў Радзівілаў (трэба ўлічыць і нясвіжскую лінію) дасягалі 7,5–9 мільёнаў польскіх злотых штогод, параўнальна з даходамі французскага каралеўскага двара ў 10 мільёнаў ліўраў. І аплата мастакоў, як ва ўзгаданага Цыбульскага, была блізкай да звычайнай: 4–6 злотых на тыдзень, 208–312 злотых штогод, плюс харчовае забеспячэнне, жытло, падарожныя. Замежным мастакам плацілі ў 3–4 разы болей, і збеглы скульптар мог разлічваць на большае. Прыкладам, архітэктар Маўрыцыа Педэці па кантракце ў брата Геранімa Фларыяна, нясвіжскага ўладара Міхаіла Казіміра “Рыбанькі” ў 1746 годзе працаваў за 80 дукатаў, ці 1440 злотых.

Але тут як у купалаўскім “Кургане”: “Не дае гусълярам сказу золата цвет…” Так у рэальнай гісторыі здзейсніўся праклён Агны Вецер, маці сапраўднага крычаўскага паўстанца з апошняй п’есы Караткевіча “Маці ўрагану”. А ў Слуцку і Белай не паўстаў першы ў Беларусі конны помнік, які па грандыёзнасці мог паспрачацца з манументамі Фрыдрыха Вільгельма ў Берліне і Пятра I у Пецярбурзе. Відаць, час даў Беларусі магчымасць пачакаць і выбраць сапраўдных герояў.

З НАГОДЫ

# ТАВАРЫСТВА АДНАДУМЦАЎ

Алена Анісім, намеснік старшыні ТБМ

**27 чэрвеня мінула дваццаць гадоў ад дня правядзення Устаноўчага сходу, на якім было абвешчана пра стварэнне Грамадскага аб’яднання “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны”.**



Памятаю, з якой радасцю я ўспрыняла гэтую навіну. Сапраўды, сітуацыя вымагала прыняцця нейкіх рашэнняў і рашучых крокаў. Усе настаўнікі роднай мовы ў сталіцы сутыкаліся з тым, што ў школах заўсёды была пэўная колькасць дзяцей — у некаторых класах даволі значная, — якія маглі не вывучаць беларускую мову (а яна ў той час з’яўлялася дзяржаўнай мовай БССР!).

Суполкі ТБМ пачалі ствараіцца амаль на кожным прадпрыемстве і арганізацыі, з падачы кіраўніцтва ўступалі цэлымі калектывамі. Па размаху і ахопленасці грамадзян гэты рух можна параўнаць з прафсаюзным. Напэўна, многія памятаюць, што напачатку 90-х ТБМ мела свае кропкі па распаўсюду адмысловай прадукцыі — значкоў, кніг, газет, мастацкіх вырабаў. Калі ўзгадаць, што неўзабаве была абвешчана незалежнасць Беларусі, прыняты Закон аб мовах, робіцца зразумелым, чаму большасць людзей паверыла ў гэты гістарычны крок і многія бацькі смела аддавалі сваіх дзяцей у беларускамоўныя класы.

У гэтай сітуацыі я, як і многія настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, думала, што нам дастаткова толькі добра выкладаць свой прадмет і імкнуцца перадаць сваю любоў да мовы дзецям. Але здарыўся 1995 год — год ганебнага рэферэндуму, які фактычна дазволіў ігнараваць дзяржаўнасць беларускай мовы і развязаў рукі тым, хто ненавідзеў усё, што датычыць беларускай культуры і духоўнасці, тым, хто лічыў беларусаў амаль непаўнавартаснай нацыяй. Памятаю роспач і адчай, якія ахапілі многіх патрыётаў пасля гэтага рэферэндуму. А затым быў накат на арганізацыю, закрыццё шапікаў і высяленне з сядзібы.

У гэты час я ўжо працавала ў Інстытуце мовазнаўства АН Беларусі. На сітуацыю глядзела крыху іначай, чым іншыя. Калі ёсць дзяржаўнае двухмоўе, то і павінна быць так: дзе ёсць руская мова, аўтаматычна павінна быць і беларуская. Менавіта на гэтай хвалі, з вялікага жадання штосьці зрабіць, я і прыйшла ў Таварыства беларускай мовы прыблізна гадоў дзесяць таму. Прыйшла — і трапіла ў атмасферу аднадумства. Сярод актывістаў арганізацыі не было ўпадніцкіх настрояў. Таварыства набывала другое дыханне. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, арганізацыя пацвердзіла свой высокі рэйтынг, сваю баяздольнасць і несумненную запатрабаванасць у грамадстве.

Думаю, што адным з самых значных крокаў Таварыства ў гэты перыяд было стварэнне Стратэгіі развіцця беларускай мовы ў XXI стагоддзі. Ідэя распрацоўкі належыць Сяргею Кручкову і Уладзю Кошчанку. Да яе далучыліся многія навукоўцы і актывісты. А Станіслаў Суднік, галоўны рэдактар “Нашага слова”, па-вайсковаму грунтоўна і дакладна падрыхтаваў аж тры варыянты свайго бачання перспектывы беларускай мовы. Спалучэнне “будзённай шэрай” працы з тэарэтычнымі напрацоўкамі на будучыню дало надзвычайны эфект: мы заснавалі акрамя “Нашага слова” яшчэ адну газету на беларускай мове — “Новы час”. І гэта ў той перыяд, як закрываліся многія іншыя незалежныя выданні. Газета атрымала новае дыханне і сучасны выгляд, калі перайшла ў рукі рэдакцыі былой “Згоды”, зачыненай уладай перад прэзідэнцкім выбарамі 2006 года.

Не так даўно паўстаў незалежны беларускамоўны тэлеканал “Белсат”, ідэя стварэння якога таксама фігуравала ў нашай Стратэгіі развіцця беларускай мовы. А колькі выдалі кніг, каляндарыкаў, іншай прадукцыі!

Не прайшлі марна і тоны перапіскі з дзяржаўнымі асобамі. Чыноўнікі прывучыліся адказваць на нашы запыты, ім даводзіцца рэагаваць на лісты грамадзян з дзесяткамі, сотнямі, тысячамі подпісаў. Думаю, тое, што мы не склалі рукі, нягледзячы на адсутнасць дзяржаўнай падтрымкі, прымусіла паважаць нашу пазіцыю і прыслухоўвацца да нашай думкі, лічыцца з ёй. Асабліва ж, на мой погляд, арганізацыя прымусіла сябе паважаць, калі здолела аплачваць арэнду сядзібы па камерцыйных коштах. І каб не самаахвярная падтрымка многіх сяброў ТБМ, якія штомесяц, а то і часцей, пералічвалі сродкі на рахунак арганізацыі, наўрад ці нашы поспехі былі б такімі заўважнымі і пераканаўчымі.

Ёсць асабіста для мяне знакавыя моманты, якія даюць падставы для аптымістычнага мадэлявання будучыні. Па-першае, сектар недзяржаўных грамадскіх арганізацый (а гэта ў значнай ступені моладзь) актыўна карыстаецца беларускай мовай у сваёй працы. Па-другое, наша краіна пачынае паступовы рух да збліжэння з іншымі краінамі на аснове агульнаеўрапейскіх стандартаў, сярод якіх захаванне і зберажэнне нацыянальнай культуры. Па-трэцяе, большасць кіраўнікоў дзяржаўных устаноў розных узроўняў валодае дзяржаўнай мовай і гатова ёю карыстацца паўсюль. А асабліва мне прыемна на пасяджэннях Рады інтэлігенцыі чуць беларускую мову з вуснаў тых, хто па сваіх прафесійных інтарэсах ніякім чынам не быў звязаны з ёю і да нядаўняга часу наўрад ці часта карыстаўся ёю. І тое, што такія людзі, як Уладзімір Парфяновіч, алімпійскі чэмпіён, свабодна выказвае свае думкі па-беларуску, для мяне значыць многае. Мова становіцца кансалідуючым звяном у справе аб’яднання здаровых інтэлектуальных сіл дзеля будучыні нашай краіны.

Напэўна, хтосьці можа аспрэчыць сказанае. Нават прывядзе шмат аргументаў, дзе будуць фігураваць лічбы, працэнты. Але я ведаю, што наша праца ўжо ўскалыхнула і абудзіла многіх людзей, хто лічыць сябе сынам роднай зямлі, незалежна ад пасады, якую яны займаюць. І я ўпэўнена, што на занятку нашай юрыдычнай школы будуць прыходзіць маладыя і старэйшыя людзі, каб разам навучыцца адстойваць свае правы. А ўвосень мы пачнём новыя справы, і ў нас будуць рэалізаваныя шматлікія ініцыятывы, якія запатрабаваны ў грамадстве, а традыцыйныя сустрэчы з пісьменнікамі, гісторыкамі будуць праходзіць пры поўных залах. І яшчэ я веру ў словы нашага старшыні Алега Трусава пра тое, што беларуская мова ў XXI стагоддзі стане мовай Еўрасаюза.

▸ ФЭСТ

# НА ХВАЛІ ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ І ПАВАГІ

Анатоль Мяльгуй

**“Амбасовішча” — не самы буйны, але адзін з самых аўтарытэтных рок-фэстаў у Беларусі. Гэты парадокс стаў магчымым таму, што “Амбасовішча” задумвалася як сапраўды свецкае музычнае мерапрыемства. Пры наяўным дэфіцыце зносін паміж музыкамі, журналістамі і прадзюсерамі, з часам гэты фэст пераўтварыўся ў разгорнутую (хоць і караткаплынную) біржу музычных ідэй і трэндаў, на якой у нязмушанай абстаноўцы за кілішкам віна ці куфлем піва абмяркоўваюцца новыя праекты і планы, дзе завязваюцца важныя дзелавыя кантакты.**

Трапіць на “Амбасовішча”, якое праводзіць у маляўнічым кутку Беларусі пад Раўбічамі амбасада ЗША ў Беларусі, — гэта значыць трапіць у кола VIP-абраных, што для альтэрнатыўных выканаўцаў і іх менеджменту ва ўмовах дзяржаўна-рускамоўнай культурнай арыентацыі вельмі важна. Не кажучы ўжо пра маладых выканаўцаў, для якіх “Амбасовішча” — прыступка да сапраўднай вядомасці і магчымасць даць паўнавартасны канцэрт перад паважнай публікай.

Добрая традыцыя “Амбасовішча” — выступленне перад беларускай аўдыторыяй часовага паверанага ў справах ЗША ў Беларусі спадара Джонатана Мура. Ён звярнуўся да гасцей фэсту пабеларуску, павітаўшы музыкаў і слухачоў. Спадар Мур нагадаў, што “Амбасовішча” — гэта не толькі фэст беларускай незалежнай музыкі, які мае сваю пяцігадовую гісторыю, але і фэст беларуска-амерыканскага ўзаемаразумення і культурнага абмену. Бо ўжо на працягу некалькіх гадоў у госці да ўдзельнікаў фэсту прыязджаюць амерыканскія музыканты.

Так, у мінулым годзе з амерыканскай музычнай культурай знаёміў беларусаў жаночы гурт “FOX TRIO”. У гэтым годзе амерыканскую рок-музыку прадставіць нью-йоркскі гурт “The Gifted Children”. Гэтая навіна выклікала ў меламанаў прыліў энтузіязму, які быў пераадрасаваны і выканаўцам, што першымі выйшлі на сцэну фэсту. Адкрыць “Амбасовішча” 2009 года было даручана беларускаму гурту “IQ 48”. Алесь Ракавец са сваімі сябрамі выканалі некалькі хітоў — фолкавую “Вясну-красну”, а таксама купалаўскую “Гэй, наперад!”. Прафесійнае выкананне і завадныя рытмы музыкі “IQ 48” зрабілі сваю справу: патрэбная фэсту танальнасць была зададзена, і добры настрой не пакідаў удзельнікаў і слухачоў.

Хоць часцяком падстаў для аптымізму было не шмат. Маю на ўвазе некаторых удзельнікаў конкурснай праграмы “Амбасовішча–2009”, у прыватнасці гурт “Батыскаф” ці англамоўных “Open Space”. На жаль, пакуль зарана гаварыць пра непаўторнае творчае аблічча гэтых каманд, хоць талентам музыкаў Бог не абдзяліў. Маладым музыкам трэба больш удзельнічаць у нацыянальным музычным жыцці, у тым ліку і ў айчынным фестывальным руху. Тады ў музыкаў не ўзнікне жадання эксплуатаваць правінцыялізм як у музычнай, так і ў моўнай сферах.

Фота аўтара



“Хуткі смоўж”

Чаго не скажаш пра маладых, але ўжо даволі ўплывовы гурт “UNIA”, які на радасць слухачам паказаў, як узрасло яго выканаўчае майстэрства, і прадэманстраваў даволі цікавыя стылістычныя эксперыменты. Гэтыя музыканты свой выбар зрабілі даўно і ўпэўнена ідуць да сваёй мэты. Яшчэ адна асаблівасць шоу, што зладзіў гурт “UNIA”, — выкарыстанне элементаў эратычнага танца. Гэта, дарэчы, было характэрна і для іншых удзельнікаў конкурсу — гуртоў “Разбітае сэрца пацана” і “Хуткі смоўж”. Такая асаблівасць рабіла сэты гэтых камандаў вельмі запамінальнымі і ўносіла ў хаду конкурснага выступу элемент здаровага спаборніцтва ў катэгорыі “жаноцкая прыгажосць”. Гурт “UNIA” быў адзначаны трэцяй прэміяй фэсту часткова і таму, што прыцягнуў увагу слухачоў сваімі галасамі ды прыгажосцю дзяўчын-вакалістак!

Фота аўтара



“Разбітае сэрца пацана”

А вось шоу гурта “Разбітае сэрца пацана” было з элементамі гратэску ў выкананні танцавальнага дуэта “ЭВМ”, удзельніцы якога шмат рабілі, каб выступ гурта запомніўся слухачам, якія потым і вырашалі лёс ганаровых узнагарод фэсту. На жаль, гэтым разам удача адвярнулася ад музыкаў, і гурт “Разбітае сэрца пацана” застаўся без месцаў у ганаровым спісе пераможцаў. Як, між іншым, і шэраг іншых каманд: маю на ўвазе легендарны і адроджаны ў новай іпастасі гурт “TESAURUS”, а таксама таленавіты арт-рокавы гурт з Берасця “Спрат”, які прывёз на фэст цікавы дэмадыск “На плынях вясны”.

Фаварытамі сёлетняга “Амбасовішча” сталі ўжо даволі вядомыя гурты з Мінска “ДетиДетей” і рок-вундэркінды са Слаўгарада гурт “Хуткі смоўж”. Адпаведна, гэтыя каманды занялі другое і першае месца ў конкурсе “Амбасовішча”. Што тычыцца сталічных музыкаў, то штучная валтузня вакол гурта “ДетиДетей”, што вядзецца ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі, наводзіць на супярэчлівыя здагадкі адносна будучага гэтай каманды. Ёсць падазрэнні, што некаторыя “дабразычліўцы” беларускай рок-музыкі рыхтуюць беларускім слухачам “сюрпрыз”, блізкі па выніках да эфекту гурта “Фляўс і Кляйн”.

Фота аўтара



TESAURUS

Колькі выказвалася спадзяванняў адносна перспектыў, колькі пажаданняў звярнуцца да роднай мовы! Але ўсе яны засталіся нясправджанымі, не дапамагла нават перамога на “Басовішчы”. Так і “ДетиДетей”, якія маюць некалькі беларускамоўных песень, клянуцца ў вернасці роднай мове, усё часцей падманваюць слухачоў, і такая тэндэнцыя не можа не засмучаць.

Фота аўтара



The Gifted Children

Затое слаўгарадскі гурт “Хуткі смоўж” проста парадаваў слухачоў: тут і запамінальныя мелодыі песень, цудоўная сакавітая мова, прафесіянальныя аранжыроўкі, і агульны пазітыўны настрой музыкі. Хацелася б адзначыць тое, што зіхоткую зладжанасць гучанню надала віртуозная духавая секцыя гурта “Хуткі смоўж”. Добры прыклад, калі рэгіянальная каманда не толькі становіцца ўпоравень, але і стварaюць канкурэнцыю сталічнымі “зоркамі”.

Ну а для некаторых выканаўцаў удзел у “Амбасовішчы” — своеасаблівы сеанс тэрапіі пасля творчых няўдач на тым жа “Еўрабачанні”. Маю на ўвазе тое, што па-за конкурснай праграмай перад беларускімі слухачамі выступіў спявак Пётр Ялфімаў, які гэтым разам выйшаў на сцэну з музыкамі свайго праекта “Pitbull”. Спадзяёмся, што ўдзел у нацыянальным фестывальным руху дапаможа Пятру і ягоным калегам зразумець тое, з якімі вынікамі можна расквітацца сваім талентам. Адзін тупіковы напрамак гэтага шляху артыст ужо зведаў.

Завяршыўся фэст “Амбасовішча–2009” сэтам амерыканскага арт-рок-гурта “The Gifted Children”, які ў сябе на радзіме мае ўжо 10 запісаных і выдадзеных альбомаў. “The Gifted Children” — відавочна, гурт некамерцыйны. Мо таму кампазіцыі музыкаў былі напоўнены электроннымі эксперыментамі, нестандартнымі кампазіцыямі і яркай рок-баладнай паэзіяй, якая адсылае слухачоў да высокіх узораў творчасці Боба Дзілана і іншых класікаў амерыканскай рок-музыкі. У той жа час гурт “The Gifted Children” абсалютна не падвержаны “зорнай хваробе”: трэба было бачыць, з якім задавальненнем амерыканскія музыкі распавядалі пра свой гурт, цікавіліся тым, што адбываецца на беларускай рок-сцэне, абмяркоўвалі вынікі “Амбасовішча”.

Фота аўтара



UNIA

Што тут казаць, калі лёс першага месца гурта “Хуткі смоўж” быў вырашаны галасамі амерыканцаў, якія ўдзельнічалі ў якасці слухачоўскага журы фэсту! Беларусам было цікава ўпэўніцца ў тым, што амерыканская музыка — вельмі разнастайная. І тое, што нам прапануе сусветны шоу-бізнес, часцяком бывае менш цікавым і запамінальным, чым такія “жывыя” музычныя кантакты. Гэта галоўны ўрок “Амбасовішча–2009”, як і выступу на ім гурта “The Gifted Children”.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Алена Анісім
Шэф-рэдактар Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 03.07.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.